Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 33 (4528) 4 верасня 2009 г.

Шанаванне духоўных каштоўнасцей

Удзельнікам і гасцям урачыстасцей Дня беларускага пісьменства

Паважаныя сябры!

Прыміце маё сардэчнае віншаванне з Днём беларускага пісьменства.

За час свайго існавання гэта свята стала адметнай з'явай культурнага жыцця краіны, сімвалам шанавання яе духоўных каштоўнасцей.

Беларускае пісьмовае слова пачыналася ад Еўфрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага, набірала моц у друкаваных кнігах Францыска Скарыны, Сымона Будната і Сімяона Полацкага, узнялося на сусветны ўзровень у творах Якуба Коласа, Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Уладзіміра Караткевіча, Івана Шамякіна, Івана Мележа, іншых выдатных літаратараў Беларусі.

Сёлета ўдзельнікаў Дня беларускага пісьменства гасцінна сустракае Смаргоншчына, якая ўзгадавала нямала слынных асветнікаў і дзеячаў культуры. З гэтай зямлёй непарыўна звязана імя Францішка Багушэвіча — нашага вялікага паэта, творчасць якога была прысвечана сцвярджэнню высокіх ідэалаў сацыяльнай справядлівасці, годнасці простага чалавека.

Шчыра жадаю ўсім арганізатарам і гасцям свята жыццёвага аптымізму, шчасця, дабрабыту і творчага плёну.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА II ПАЎГОДДЗЕ 2009 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў: 1 месяц — 7760 руб. Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска: 1 месяц — 10060 руб. Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: на 1 месяц — 5200 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска для ўстаноў культуры і адукацыі: 1 месяц — 7870 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

6 верасня, Смаргонь: Дзень беларускага пісьменства



Фота Кастуся Дробава

Стагоддзямі пяццю ўскалыханы

І плоць і дух тутэйшых ты зямель,
у плынях часу твой выток схаваны.
Смаргонь, Смаргонь —
наш родны карабель,
пяццю стагоддзямі ускалыханы.

Ніякі шторм цябе не пахіліў,
ніякая навала не спыніла.
І дзякуй Богу, што да нас даплыў,
і кроў твая жывая не астыла.

Як доўга ты у неба пазіраў
і меў заўжды апеку ад нябёсаў.
О, колькі, горад наш ты, увабраў
благіх і добрых чалавечых лёсаў!

Як шмат гадоў віленская шаша
цябе штодзень,
штоноч перасякала.
Пералілася ў нас твая душа,
твая душа у нас запанавала.

Смаргонь, Смаргонь,
твая душа пяе,
прыгожае аблічча годна ўзнята.
Трапечуцца ўсе ветразі твае
у дзень будзённы
ці як прыйдзе свята.

Мар'ян ДУКСА

Удзельнічаю ў навукова-асветнай экспедыцыі "Дарога да Святыняў", якая традыцыйна праходзіць перад Днём беларускага пісьменства і наведвае святыя мясціны, помнікі Беларусі. Сёлетняя дарога складзе каля паўтары тысячы кіламетраў і завершыцца яна ў Смаргоні. Удзельнікі экспедыцыі — літаратары, журналісты, артысты, святары, прадстаўнікі грамадскасці — вязуць з сабой лампаду са святым агнём ад Труны Гасподняй.
Ад гэтай лампады па ўсім шляху запальваюць свечкі тысячы праваслаўных і каталікоў Беларусі. Смаргоншчына — мая Радзіма і, натуральна, падзея ўспрымаецца з асаблівым хваляваннем.

Новы праваслаўны сабор у цэнтры Смаргоні.

Генадзь ПАШКОЎ

З агнём святым — да Смаргоні

Сцвярджаць бяруся смела:
з легендаў край увесь!
Муры старыя Крэва...
Залесся паланез...

Сівыя валатоўкі.
Бароў адвечны гуд.
Францішка
смела
слоўка
агучылася тут.

Ілбы памшэлі дотаў
з далёкае пары.
Калючы лёс,
гаротны
быў, што ні гавары.

Ці Жодзішкі,
ці Войстам —
дасціпны скрозь народ.
Тут адчуваеш востра
свой хлебадарны род.

Бо праца рук старанных
адметнаю была.
Смаргонскім абаранкам
кацілася хвала.

Царква дабраверанага Аляксандра Неўскага ў вёсцы Крэва. (1854 год).

А як згадаць
па тэме,
то, братка, паглядзі:
дыпломы акадэміі
тут мелі медзвядзі.

Вяртаюся азораны!
Ды змахваю слязу:
агонь —
ён дабратворны —
з сябрамі я вязу!

Б'е птах у звон.
Шчаслівы
пад купалам нябёс.
Вітаю, край мой мілы —
мая любоў і лёс!

Ва ўрачыстым кантэксце

Дзень беларускага пісьменства — адна з самых значных падзей у жыцці краіны — свята кнігавыдаўцоў, кнігараспаўсюджвальнікаў, пісьменнікаў, журналістаў і ўсіх тых, хто мае дачыненне да роднага слова. Галоўным ініцыятарам і асноўным арганізатарам свята з'яўляецца Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, якое ўзначальвае Уладзімір РУСАКЕВІЧ. Уладзімір Васільевіч пагадзіўся адказаць на пытанні карэспандэнта "ЛіМа".

— Уладзімір Васільевіч, у чым адметнасць сёлетняга Дня беларускага пісьменства?

— Напярэдадні свята, 5 верасня, у Смаргоні будзе праведзены "круглы стол", прымеркаваны да Дня беларускага пісьменства. Ён арганізоўваецца трэці раз пад патранатам нашага міністэрства рэдакцыйна-выдавецкай установай "Літаратура і Мастацтва". Тэму "Мастацкая літаратура як сродак зносін народаў" абмяркуюць пісьменнікі з Беларусі, Расіі, Сербіі, Чарнагорыі, Польшчы, Казахстана, Літвы. Традыцыйна адбудзецца навукова-практычная канферэнцыя "Смаргонскія чытанні". А ўвечары гэтага ж дня ў Летнім амфітэатры, што знаходзіцца ў Гарадскім парку, адбудзецца канцэрт ансамбля салістаў "Класік-Авангард" Белдзяржфілармоніі "Пад гукі даўніх паланезаў...". Праграма складзена з твораў кампазітараў XIX стагоддзя, творчыя лёсы якіх цесна звязаны з беларускай культурай. Гэта Мечыслаў Карловіч, Станіслаў Манюшка, Флярыян Міладоўскі, Міхал Клеафас Агінскі.

Першая падзея святочнага дня — Божая Літургія ў Саборы Праабражэння Гасподняга, якая стане завяршэннем навукова-асветнай экспедыцыі "Дарога да Святыняў". На Цэнтральнай плошчы Смаргоні будзе размешчана галоўная сцэна, дзе адбудзецца ўрачыстая цырымонія адкрыцця Дня беларускага пісьменства, а таксама шматлікія канцэртныя выступленні мастацкіх калектываў Гродзенскай вобласці і Смаргонскага раёна, вячэрні святочны канцэрт. На сцэне Летняга амфітэатра пройдзе цырымонія ўзнагароджання пераможцаў нацыянальнага конкурсу "Мастацтва кнігі" і Рэспубліканскага конкурсу на лепшы твор у галіне паэзіі, прозы, драматургіі, літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства, дзіцячай літаратуры, публіцыстыкі, перакладу, сатыры і гумару, дэтэктыўнага, гісторыка-краязнаўчага і песеннага жанраў.

У рамках Фестывалю кнігі і прэсы на імправізаваных пляцоўках разгорнуцца тэматычныя кніжныя выставы "Шлях да ведаў", "Зямля пад белымі крыламі... Году роднай зямлі прысвячаецца", "Ніколі не забудзем... да 65-годдзя вызвалення Беларусі". Адбудуцца прэзентацыі беларускіх выдавецтваў і новых кніг, сустрэчы з пісьменнікамі, выдаўцамі. На працягу дня ўсе жадаючыя змогуць наведаць з экскурсіямі музей-сядзібу Францішка Багушэвіча ў Кушлянах. Там жа пройдзе "Літаратурная гадзіна", падчас якой беларускія і замежныя літаратары выступяць са сваімі творамі.

— Свята праводзіцца ўжо 16-ы раз. Ці магчыма было б праводзіць яго непасрэдна на малых радзімах нашых славутых літаратараў і асветнікаў? Да прыкладу, Васіль Цяпінскі — вёска Цяпіна Чашніцкага раёна, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч — фальварак Панюшкавічы Бабруйскага раёна?

— Цэнтрамі правядзення свята заўсёды абіраюцца гарады, звязаныя з імёнамі нашых славутых асветнікаў, літаратараў, дзеячаў культуры. Але ладзіць свята непасрэдна на малой радзіме кожнага з іх — немэтазгодна. Прычына ў адсутнасці там магчымасцей прымаць тысячы людзей, што прыязджаюць на Дзень беларускага пісьменства.

— У аснову канцэпцыі свята пакладзена ідэя прапаганды дасягненняў айчыннай пісьмовай культуры. Якія падзеі ў беларускім кнігадрукаванні вы б адзначылі з часу правядзення Дня пісьменства ў Барысаве?

— Колькасныя паказчыкі выпуску кніг у рэспубліцы ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года практычна не змяніліся — за першае паўгоддзе выдадзена 6703 найменні кніжнай прадукцыі агульным тыражом 25,3 млн. экземпляраў.

У 2008-2009 гг. працягваецца рэалізацыя шэрага значных па змесце і якасных па выкананні выдавецкіх праектаў. Свет пабачылі фотаальбомы "Барысаў" (да мінулагодняга Дня беларускага пісьменства), "Орша" (да свята "Дажынкі-2008"). Аналагічныя выданні, прысвечаныя Смаргоні і Кобрыну, выйдуць і сёлета. Пабачылі свет тамы энцыклапедыі "Рэспубліка Беларусь". Варта звярнуць увагу на выхад энцыклапедычных даведнікаў "Туристские регионы Беларуси", "Музеі Беларусі", "Каталіцкія храмы Беларусі", "Бульба белорусская", "Суверенная Беларусь: Иллюстрированная история государства. 1991 — 2008".

У выдавецтве "Мастацкая літаратура" працягнуты выпуск кніг у серыях "Беларуская паэзія XX (XXI) стагоддзя", "Беларуская проза XX (XXI) стагоддзя", "Залатое пяро", "Дэбют", "Сучасны беларускі дэтэктыў", "Скарбы роднай прыроды", "Гісторыя ў асобах", "Казачны свет".

Да 600-годдзя Белавежскай пушчы падрыхтаваны і выдадзены фотаальбомы "Белавежская дзіва", кніга-альбом "Царские охоты в Беловежской пуще", факсімільнае выданне Георгія Карцава "Беловежская пуща: 1382 — 1902", а таксама прэзентацыйны фотаальбом высокага мастацкага ўзроўню "Зямля сілы".

— Дзень пісьменства — гэта найперш свята кнігі. Якія прыярытэтныя захады робяцца для захавання і развіцця беларускамоўнай кніжнай прасторы?

— Сёння галоўнае не страціць тыя льготы і прэферэнцыі, якія мае беларускае кнігавыданне — адсутнасць арэндной платы ў кніжнага гандлю і выдавецтваў, выдзяленне субсідый на выпуск кніг, у першую чаргу беларускамоўных, дзяржаўная дапамога ў выглядзе прыярытэтнай закупкі бібліятэкамі сацыяльна значнай літаратуры. У 2009 годзе дзяржавай былі выдаткаваны дадатковыя фінансавыя сродкі на выпуск кніг з серыі "Школьная бібліятэка" (больш як 20 выданняў) для бясплатнай пастаўкі іх ва ўстановы адукацыі. Гэта вялікая дапамога выдавецтвам і добры падарунак дзецям.

— Кожны год у свяце прымаюць удзел замежныя госці. Найперш гэта прадстаўнікі славянскага свету. Ці магчыма пашырэнне святкавання Дня беларускага пісьменства як свята культур народаў славянскіх краін?

— Дзень беларускага пісьменства — свята унікальнае, глыбока нацыянальнае па сваім змесце. У шэрагу іншых яно займае асаблівае месца, бо аб'ядноўвае ўсіх тых, хто нераўнадушна і з павагай ставіцца да роднага слова, духоўных здабыткаў нашага народа. Яно сведчыць пра важнасць духоўнай спадчыны, значэнне традыцый мастацкага слова, пісьмовай культуры ў жыцці беларусаў. Варта нагадаць, што свята праводзіцца не толькі ў "сталіцах" — гарадах, дзе адбываюцца асноўныя мерапрыемствы. Урокі ў школах, сустрэчы з літаратарамі, навукоўцамі, дзеячамі культуры адбываюцца па ўсёй краіне.

Натуральна, што ў аснову канцэпцыі Дня беларускага пісьменства таксама пакладзены паказ цеснай сувязі беларускага друкаванага слова са славянскімі вытокамі. На працягу ўсяго свайго гістарычнага шляху пісьменства і друк на Беларусі развіваліся ў агульнаславянскім, агульнаеўрапейскім кантэкстах. Пра гэта сведчыць і традыцыйны ўдзел у святочных мерапрыемствах гасцей са славянскіх краін, прадстаўнікоў пасольстваў дзяржаў славянскага свету.

Да таго ж ёсць свята славянскага пісьменства і культуры, якое адзначаецца штогод 24 мая ў гонар Святых Кірылы і Мяфодзія. Беларусь таксама прымае ўдзел у гэтых мерапрыемствах.

Гутарыў Дзмітрый БЕРАЖНЫ

Святочны падарунак

У РВУ "Літаратура і Мастацтва" нядаўна выйшла кніга "Свіцязянская русалка", Уладзіміра Ліпскага. Гэты зборнік нарысаў — нібыта дзіцячая версія даведніка для вандроўнікаў, у ім — расповеды пра адметнасці, цікавыя мясціны, гістарычныя звесткі, паданні з розных куткоў Гродзенскай вобласці. Пры гэтым не ўсе постаці і падзеі, пра якія ідзе гаворка ў кнізе, вядомыя чытачу, некаторыя з іх, магчыма, стануць адкрыццём і для дарослых.

Чытаючы, напрыклад, пра Бераставіччыну, дзеці даведаюцца пра славутых вучоных Восіпа Кавалеўскага, Ігната Анацэвіча, "мяцежнага паэта" Фелікса Ражанскага, франтавога фатографа Рамана Салаўя. Навагрудчына паўстане ў вобразах Замкавай гары, Міндоўга, Лаўрышаўскага Евангелля, чароўнай Свіцязі, Адама Міцкевіча ды Яна Чачота. Слонімшчына адлюстраваная тэатрам і каналам Агінскага ды Жыровіцкім Свята-Успенскім манастыром. Зэльва, што "на цуды багатая вельмі", запомніцца сваімі мужнымі героямі, Лідскі раён — канечне ж, старажытным замкам, Ашмянскі — родавым гняздом князёў Гальшанскіх, а Карэліцкі — блакітным покрывам кветак ільну, Мірскім замкам ды казкамі Алеся Ваўчка.

Ёсць у кнізе і раздзел, прысвечаны Смаргоншчыне. Ён распавядзе маленькім чытачам пра замак Гедыміна ў Крэве, дзе была падпісаная дамова аб з'яднанні Польскага каралеўства і Вялікага княства Літоўскага, нагадае мудры запавет Францішка Багушэвіча, растлумачыць, чаму на гербе Смаргоні прысутнічае выява чорнага мядзведзя, якія парады даваў свайму сыну вядомы кампазітар Міхал Клеафас Агінскі і адкуль пайшлі "звярыныя" прозвішчы многіх жыхароў раёна.

Кніга "Свіцязянская русалка" падкажа дзецям ды іх бацькам, куды скіравацца ў падарожжа і дзе пабачыць сапраўдную беларускую спадчыну.

Саша ДОРСКАЯ

Старажытныя знакі краіны

Старшыня Смаргонскага райвыканкама Мечыслаў Гой знаёміць нашых чытачоў з гісторыяй раёна.

"Увогуле не памыліліся, калі ў Гродзенскай вобласці выбралі Смаргонь для правядзення свята, — кажа Мечыслаў Браніслававіч. — Гэта горад з багатай гісторыяй. Многае давялося пабачыць Смаргоншчыне на працягу стагоддзяў. На гэтых землях, у першую чаргу ў Крэве, адбывалася станаўленне Вялікага княства Літоўскага, менавіта тут у старажытныя часы пісаліся розныя дамовы і пагадненні, абмяркоўвалася будучыня нашай краіны. Былі, праўда, і трагічныя старонкі ў гісторыі. Не абмінулі Смаргоншчыну спусташальныя паходы шведскіх заваёўнікаў, якія вырашалі спрадвечныя спрэчкі з Масквой, ды і руска-французская вайна 1812 года таксама закранула яе сваім чорным крылом".

— Цяжкія выпрабаванні выпалі і ў XX стагоддзі. Найбольш пацярпеў смаргонскі край у часы Першай сусветнай вайны, стаўшы на даволі працяглы час эпіцэнтрам супрацьстаяння дзвюх найвялікшых армій свету. Драпежны Рыжскі падзел 1921 года крывавай ранай адгукнуўся ў сэрцы беларускага селяніна. І гэтым разам Смаргоншчына не стала на калені. Не скарылася яна жорсткаму і крываваму ворагу і ў часы Вялікай Айчыннай вайны.

— *Смаргонская зямля шырокавядомая сваімі ўраджэнцамі і жыхарамі.*

— Безумоўна. На нашай зямлі тварылі выдатныя пісьменнікі, музыкі, мастакі. Залессе стала, па сутнасці, родным для вядомага кампазітара і дыпламата Міхала Клеафаса Агінскага. Бо якраз тут ім быў напісаны знакаміты паланез "Развітанне з Радзімай". Тут жа праявіўся і ягоны бліскучы талент як гісторыка і апавядальніка, калі ён стварыў чатыры тамы "Мемуараў пра Польшчу". Дзякуючы гэтаму чалавеку, Залессе ў XVIII стагоддзі пачалі называць "Паўночнымі Афінамі".

У родавым маёнтку, што знаходзіцца на памежжы сучаснай Смаргоншчыны і Вілейшчыны, прайшлі дзіцячыя і юнацкія гады пісьменніка і мемуарыста Ігната Ходзькі. Велізарную каштоўнасць маюць ягоныя кнігі "Літоўскія малюнкі" і "Літоўскія паданні", дзе так хораша апісаны бацькоўскія мясціны аўтара. Ды і пахаваны ён на Смаргоншчыне, на старых каталіцкіх могілках вёскі Войстам.

Руплівай і дбайнай гаспадыняй маёнтка ў Дабраўлянах была пісьменніца і калекцыянер Габрыэля Пузына, аўтар шматлікіх зборнікаў паэзіі. З гэтай зямлёю звязаны імёны і творчая дзейнасць Юльяна Бакшанскага і Яна Карловіча, вядомага польска-беларускага мовазнаўцы, этнографа і фалькларыста. Смаргонскі край даў прытулак, абагрэў і абнадзеіў, стварыў спрыяльныя творчыя ўмовы і для Францішка Багушэвіча — класіка роднай літаратуры. У ваколіцах Вішнева папаўняў свае фальклорна-этнаграфічныя зборы паэт Адам Гурыновіч.

— *З вашых мясцін выйшаў цэлы шэраг знакамітых дзеячаў мастацтва і культуры. А што датычыць сучасных творцаў?*

— Смаргонская зямля маральна падтрымала, дала пуцёўку ў далейшае жыццё, зрабілася другой радзімай і для такіх вядомых беларускіх літаратараў, як Мар'ян Дукса, Алесь Жамойцін, Ала Клемянок, Сяргей Верамейчык.

— *Мечыслаў Браніслававіч, а чаго чакаеце ад сёлетняга свята?*

— Чакаю добрых гасцей, якім жадаю прыемна правесці час. Бо праграма будзе насычанай і цікавай. Пастараемся зрабіць так, каб усім было добра.

— *Святочная праграма будзе насычанай. А што ў ёй вы адзначылі б як самае важнае?*

— Гэта асвячэнне сабора, які будаваўся каля 20 гадоў. Таксама важны момант — адкрыццё помніка Францішку Багушэвічу.

Смаргонь — горад з дынамічным развіццём. І ў Дзень беларускага пісьменства будзе праходзіць адмысловая выстава 18 нашых прадпрыемстваў. Яны пакажуць сваю прадукцыю, якая экспартуецца ў 20 краін свету.

У Летнім амфітэатры абавязкова раю наведаць канцэрт маладых выканаўцаў, які арганізоўваецца Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі. І сам таксама збіраюся на ім прысутнічаць.

Гутарыў Павел РАДЫНА

Фота Кастуся Дробава

Адсюль уцякаў Напалеон

Аляксей БУМАЙ — загадчык Смаргонскай раённай дзіцячай бібліятэкі. Менавіта тут ён стварыў найбагацейшы куток краязнаўства. Нават бібліятэчны сайт мае адмысловую шапку: "Краязнаўчая гасцёўня". З Аляксеем Міхайлавічам мы пазначаем лёсавызначальныя для Смаргоні перыяды, найперш звязаныя з друкаваным словам.

— Бібліятэка Х. Зяновіча калісьці тут існавала, у XV стагоддзі. Зяновічы завяшчалі захоўваць кнігі ў нашым касцёле. Датай пабудовы касцёла лічыўся 1503 ці 1505 год. Але ёсць звесткі, што ў 1612 годзе ён яшчэ будаваўся. "Інвентары магнацкіх уладанняў" пра гэта сведчаць. У тых жа "Інвентарах" — запіс, які сведчыць, што спадар Зяновіч завяшчае свайму сыну "хараніць бібліятэку вечна ў гэтым месцы". Але так атрымалася, што род Зяновічаў згас. А жанчына-нашчадак Ганна Соф'я Зяновіч выйшла замуж за Радзівіла Альбрэхта Уладзіслава — Радзівілам усё ўладанне і перайшло. Смаргонь вядомая мядзведжай акадэміяй, абаранкамі — абваранкамі (дарэчы, і прафесар Пахлёбкін у "Кулінарыі ад А да Я" піша, што цеста абварное ад Смаргоні пайшло). Пазней была гарбарная вытворчасць. На наш гарадок, у якім было тады (1904 г.) прыкладна 15 тысяч жыхароў, пабудавалі 44 гарбарныя і 10 скурана-саф'янавых заводаў — яшчэ да Першай сусветнай вайны! Сыравіну для нас вазілі нават з Сярэдняй Азіі, з Бураціі. І тут скура апрацоўвалася. Нават існавала вуліца Гарбарная.

Але мы найперш знакамітыя сваімі людзьмі. У першую чаргу сярод іх — вядома, Францішак Багушэвіч, Міхал Клеафас Агінскі. У нас самыя папулярныя стэнды — пра гэтых людзей. Шмат і тых, хто звязаў свой лёс са Смаргоншчынай. Прыехаў неяк да нас француз — фотамастак. Пытаецца: а чаму тут, сярод знакамітасцяў, і Напалеон ёсць? Дык вось, Смаргонь вядома тым, што Напалеон адсюль уцякаў. Шмат наконт паданняў, казанняў — і скарбы Напалеона тут шукаюць — гэта таксама вялікая старонка нашай гісторыі. А быў тут француз-фотамастак таму, што шукаў тое месца, дзе ваяваў у Першую сусветную яго дзед. І, напэўна, чацвёртая наша адметнасць — што адбывалася тут у Першую сусветную вайну: 810 дзён трымалі абарону рускія войскі.

— *А літаратурная спадчына?*

— Са Смаргонню звязаны пісьменнікі В. Катаеў, М. Зошчанка, А. Талстая. У першую сусветную яны ваявалі тут. Талстая шпіталем у Залессі кіравала, Зошчанка быў паручнікам, затым штабс-капітанам. Катаеў тут таксама ваяваў. Яны двое пакінулі літаратурныя ўспаміны. Вось, збор твораў Катаева, 7 том. Ён аўтабіяграфічны і прысвечаны падзеям пад Смаргонню. На жаль, большасць іншых матэрыялаў у папках пакуль захоўваецца... А наконт бібліятэкі Зяновічаў думаю, што Радзівілы вывезлі яе ў свой час. Не прапала ж яна цалкам.

— *Значыць, бібліятэка Зяновічаў тут не засталася? А дзе яна можа быць?*

— Ведаеце, Смаргонь у Радзівілаў была не асноўным уладаннем. Яны сюды рэдка наязджалі, калі, можа, у мядзведжую акадэмію — на гулянні. Хаця і мядзведзяў вывозілі да сябе ў Нясвіж.

— *А што ж з літаратурнай спадчыны засталося ў касцёле?*

— Трэба бачыць фота касцёла пасля Першай сусветнай вайны — які выгляд ён меў. Тады зразумееце, што тут нічога не магло ацалець. А эвакуіраваліся напярэдадні, за адны суткі. 15 тысяч насельніцтва ішлі па дарозе пешшу — царскія войскі людзей эвакуіравалі спешна, і тым выратавалі жыцці. Многія пасля не вярнуліся, некаторыя вярнуліся, напісалі ўспаміны. Прыкладам, дачка знанага фабрыканта Шуткавера — яна між іншым рэвалюцыянеркай была, у свой час нават ганаровым грамадзянінам Смаргоні. А тут, прама ў цэнтры горада ішлі пазіцыйныя баі. Якраз на беразе рэчкі Оксна. На адным беразе — рускія, на другім — немцы. Разбіта ўсё было ўшчэнт. Касцёл адноўлены — самая наша вялікая каштоўнасць. Усё ж помнік XV стагоддзя, нараджэнне горада з ім звязваюць.

— *Як вы, краязнавец, ставіцеся да вядомых легенд пра паходжанне Смаргоні?*

— Адной з іх, пэўна, найбольш распаўсюджанай, я прытрымліваюся. Смаргонь — ад літоўскага слова "сморгіс"— падмайстэрак, вучань майстра. У нас тут у XVI стагоддзі народ масцеравіты быў: больш як 22 спецыяльнасці! Для мястэчка гэта вельмі многа. А больш прыгожыя легенды — пра "морг" і "гоні". "Морг" — гэта зямельны надзел, а "гонь" — адзін пракос. Мястэчка маленькае, больш як адзін пракос, відаць, і прайсці было немагчыма.

Гутарыла Ярына РЫТАМІНСКАЯ

Фота аўтара

Мядзведжыя акадэмікі

Адметнай рысай старажытнай Смаргоні з'яўлялася знакамітая "Смаргонская акадэмія" — жартоўная назва промыслу лавіць і дрэсіраваць мядзведзяў, — заснаваная князямі Радзівіламі ў гэтым горадзе (адна са школ беларускіх скамарохаў).

Промысел існаваў з XVII да канца XVIII стагоддзя. Мядзведзяў дрэсіравалі недалёка ад Смаргоні (на так званых "французскіх узгорках") у некалькі прыёмаў. Спачатку маладых мядзведзяў вучылі "танцаваць", для чаго іх саджалі (па 2 — 3) у спецыяльную клетку, у якой падагравалася дно, і прывучалі стаяць на задніх лапах і перамінацца з адной лапы на другую (выпрацоўваўся болевы рэфлекс пад удары бубна), потым вучылі барукацца, кланяцца.

Павадыры ("мядзведнікі") з вучонымі звярамі хадзілі на заробкі не толькі па Беларусі, выступалі таксама на кірмашах у Расіі, Венгрыі, Германіі і іншых краінах, вялі прыбытковы гандаль дрэсіраванымі мядзведзямі. Сцэна з дрэсіраваным мядзведзем была нават у батлейцы: выводзілі лялек — скамароха і мядзведзя, якіх называлі "смаргонскі вучыцель з вучнем".

Гісторыя, звязаная са "Смаргонскай акадэміяй", увасобілася ў гербе раённага цэнтра: відарыс прадстаўляе сабою на срэбраным полі іспанскага шчыта на чырвонай рашотцы чорнага мядзведзя, што стаіць на задніх лапах, у пярэдніх лапах якога герб Радзівілаў — на блакітным полі размешчаны тры чорныя паляўнічыя рогі, злучаныя ў цэнтры муштукамі.

Віктар КАВАЛЁЎ

На здымку: гравюра XVI ст.

Фота аўтара

Свая бібліятэка — у кожным мікрараёне

Больш як 2000 экземпляраў кніг будзе перададзена падчас Дня беларускага пісьменства ў дар бібліятэкам Смаргоншчыны.

Памяшканне, дзе цяпер размяшчаецца цэнтральная раённая бібліятэка Смаргоні, пабудавана яшчэ ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Напачатку гэта была аптэка. Будынак невялікі, але двухпавярховы. На першым яго паверсе — чытальная зала, на другім — абанемент. Аддзел камплектавання і абслугоўвання ўвогуле знаходзіцца ў іншым памяшканні — з-за адсутнасці плошчаў.

Але два гады, як бібліятэкары тут працуюць у аўтаматызаваным рэжыме, не карыстаюцца папяровымі фармулярамі — усё занатоўваецца на камп'ютэры. А пры выбары літаратуры наведвальнікі часта "гартаюць" электронны каталог "Ретро-Гродно".

— Мы гэты каталог рэдагуем і выконваем любы запыт чытача значна хутчэй і якасней, — тлумачыць дырэктар цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Смаргонскага раёна Таццяна Арловіч. — Аператыўнасць дастаўкі кнігі залежыць ад таго, наколькі далёка знаходзіцца бібліятэка. Калі чытачу патрэбна кніга тэрмінова, можам знайсці яе нават на наступны дзень. У бібліятэчную сістэму Смаргоншчыны ўваходзяць 28 бібліятэк: 6 з іх у горадзе і 22 — у сельскай мясцовасці.

Асаблівасць горада ў тым, што ён падзяляецца на мікрараёны. Адна бібліятэка ў мікрараёне "Усходні", адна — у "Заходнім" і г. д. Дзве бібліятэкі размяшчаюцца ў самым цэнтры горада. І менш бібліятэк быць не павінна ні пры якіх умовах. Тая колькасць чытачоў, якіх яны абслугоўваюць, гаворыць сама за сябе. Сёння ў сістэме 31 тысяча чытачоў.

— *Хто з'яўляецца вашым чытачом? І што чытаюць?*

— Чытаюць усе слаі насельніцтва. 80 працэнтаў — гэта людзі сярэдняга ўзросту. Шмат чытае моладзь. Асабліва тыя, хто вучыцца. І пенсіянеры — таксама. У нас выдатная падпіска! Практычна на першае паўгоддзе патрацілі каля 41 мільёна рублёў. Падпіска — гэта ж яшчэ і папаўненне нашых фондаў.

— *Яны састарэлыя?*

— Апошнім часам фонды добра абнаўляюцца. 15-працэнтны нарматыў, вызначаны для камплектавання бібліятэк, намі выконваецца. У кожным разе, летась набылі літаратуры больш як на 16 працэнтаў ад сумы, выдаткаванай на ўтрыманне бібліятэк. Сёлета ў першым паўгоддзі крыху менш — ёсць праблемы, на жаль. Але, спадзяёмся, што да канца года будуць выдаткаваны дастатковыя сродкі. Набываем мы літаратуру, якая патрэбна чытачу для баўлення часу, адпачынку ды павышэння агульнаадукацыйнага ўзроўню.

— *Бібліятэкі апошнім часам становяцца сацыякультурнымі цэнтрамі раёна...*

— Так, часта да нас прыходзяць па прававую літаратуру, яна карыстаецца попытам. У нас працуе публічны цэнтр прававой інфармацыі — у цэнтральнай бібліятэцы і нават у трох бібліятэках на раёне, у бібліятэках аграгарадкоў. Устаноўлены праграмы "Эталон часу", якія штомесячна папаўняюцца. І набываем новыя выданні прававой літаратуры. Студэнты пытаюцца пра літаратуру па розных галінах ведаў: па эканоміцы і паліталогіі, па літаратуразнаўстве. Ёсць пры бібліятэцы і літаратурнае аб'яднанне "Сустрэчы". Яго госці — паэты і пісьменнікі, ураджэнцы Смаргоншчыны, людзі, вядомыя ў краіне. Запрашаем нашых землякоў з Мінска, Гродна.

— *Наколькі запатрабавана беларускамоўная літаратура?*

— Уся наша беларуская падпіска — гэта 125 часопісаў, якія выдаюцца ў Беларусі, таксама шмат газет. Мы выпісалі 10 экземпляраў часопіса "Маладосць", 9 — часопіса "Мастацтва", 8 экземпляраў — гэта часопіс "Нёман", 4 — газета "ЛіМ". Праўда, лічу, што "ЛіМа" ў нас павінна быць значна больш.

Ярына РЫТАМІНСКАЯ

На здымках: дырэктар цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Смаргонскага раёна Таццяна Арловіч; фасад бібліятэкі; інтэр'ер залы абанемента.

Фота аўтара і з архіва бібліятэкі

Імі ганарыцца Смаргоншчына

Міхал Клеафас АГІНСКІ (1765 — 1835) — вядомы кампазітар, музыкант, мемуарыст, грамадскі і палітычны дзеяч. Нарадзіўся ў горадзе Гузаве каля Варшавы. Удзельнічаў у паўстанні пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі, пазней эмігрываў. Жыў у Вене, потым пераехаў у Венецыю, з 1802 года — у маёнтку Залессе, дзе пабудаваў новы палац, разбіў парк у англійскім стылі, заснаваў аранжарэі, звярынец, сабраў вялікую бібліятэку. У 1822 годзе выехаў у Італію, дзе памёр і пахаваны. Галоўнае ў творчай спадчыне М. Кл. Агінскага — фартэпіянныя п'есы, паланезы, мазуркі, маршы, вальсы і рамансы.

Яму прыпісваецца аўтарства музыкі песні «Яшчэ Польшча не згінула» — польскага нацыянальнага гімна. Аўтар славутага паланеза лямінор «Развітанне з Радзімай».

Аляксандр ХОДЗЬКА (1804 — 1894) — паэт, фалькларыст, славіст і ўсходазнавец. Нарадзіўся ў мястэчку Крывічы Вілейскага павета. Вучыўся ў Віленскім універсітэце, потым на Вучэбным аддзяленні жывых моў Азіяцкага дэпартамента Міністэрства замежных спраў у Пецярбургу. Кандыдат філасофіі. У час навучання ў Пецярбургу сябраваў з А. Міцкевічам, А. Пушкіным, В. Жукоўскім. Аўтар паэмы «Залессе» (1821), зборніка «Паэзія» (1829), стылізаванай «усходняй» аповесці ў вершах «Дэрар» (1839), успамінаў пра А. Міцкевіча.

Ігнат ХОДЗЬКА (1794—1861) — пісьменнік, мемуарыст, грамадскі дзеяч. Нарадзіўся ў вёсцы Забложчына Вілейскага павета. Вучыўся ў Віленскім універсітэце, дзе ўваходзіў у прагрэсіўныя студэнцкія арганізацыі. Кандыдат філасофіі. Быў сябрам таварыства шубраўцаў і масонскай ложы ў Мінску, уваходзіў у склад Віленскай археалагічнай камісіі. Большую частку жыцця правёў у маёнтку Дзявятня, што на Смаргоншчыне. Аўтар кніг «Літоўскія малюнкі» (1840 — 1863), «Мемуары скарбніка» (1844), «Літоўскія паданні» (1852 — 1860) і іншых.

Габрыеля ПУЗЫНА (1815—1869) — пісьменніца, асветніца, мемуарыстка, грамадская дзяячка. Нарадзілася ў Вільні. Да шлюбу жыла ў родавым маёнтку ў Дабраўлянах, што на Смаргоншчыне, дзе бывалі вядомыя дзеячы тагачаснай беларускай і польскай культур. Аўтар паэтычных і празаічных кніг «У імя Бога» (1843), «Далей у свет» (1845), «Прозай і вершам» (1856), «Проза і вершы» (1857) і іншых.

Францішак БАГУШЭВІЧ (1840 — 1900) — паэт, празаік, публіцыст, класік беларускай літаратуры. Нарадзіўся ў фальварку Свіраны Віленскага павета. Паходзіў з небагатай шляхецкай сям'і. У 1841 годзе сям'я Багушэвічаў пераехала ў маёнтак Кушляны, што на Смаргоншчыне. Вучыўся ў базыльянскай школе, у Віленскай гімназіі, на фізічна-матэматычным факультэце Пецярбургскага універсітэта. Браў удзел у паўстанцкім руху. Быў паранены, доўга хаваўся ад паліцыі, выехаў ва Украіну, дзе скончыў Нежынскі юрыдычны ліцэй. Працаваў канцылярскім чыноўнікам, судовым следчым у Чарнігаўскай і Валагодскай губернях. У 1884 г. перабраўся ў Вільню, дзе пачаў актыўна займацца літаратурнай і публіцыстычнай дзейнасцю. У 1898 годзе захварэў і пераехаў у Кушляны, дзе неўзабаве памёр. Пахаваны ў вёсцы Жупраны на Ашмяншчыне. Пры жыцці выдаў кнігі, знакавыя для ўсёй беларускай культуры: «Дудка беларуская» (1891), «Тралялёначка» (1892), «Смык беларускі» (1894).

Адам ГУРЫНОВІЧ (1869 — 1894) — беларускі паэт-дэмакрат, рэвалюцыянер, фалькларыст, пачынальнік дзіцячай літаратуры. Нарадзіўся ў фальварку Кавалі (цяпер Кавалькі) Вілейскага павета. Паходзіў са старажытнага небагатага шляхецкага роду. Пазней сям'я жыла ў Крыстынопалі (Свянцянскі павет, цяпер Смаргонскі р-н). Скончыў Віленскае рэальнае вучылішча, вучыўся ў Пецярбургскім тэхналагічным інстытуце. У студэнцкія гады напісаў свае найлепшыя творы, пачаў сур'ёзна займацца вывучэннем літаратуры. Збіраў фальклор у ваколіцах Крыстынопаля. За ўдзел у падпольных студэнцкіх арганізацыях у 1893 годзе быў арыштаваны. Пісаў на беларускай, польскай і рускай мовах. Займаўся перакладамі на беларускую мову.

Ісак ІТКІНД (1871 — 1969) — савецкі скульптар. Нарадзіўся ў вёсцы Дзікаркі на Смаргоншчыне. Вучыўся ў Вільні і ў Маскве. Яго першым настаўнікам быў знаны жывапісец, прафесар Кракаўскай акадэміі мастацтваў Фердынанд Рушчыц. Ствараў скульптуры пераважна з дрэва. Быў членам Саюза рускіх мастакоў, удзельнічаў у ажыццяўленні так званага "ленінскага плана манументальнай прапаганды".

Мечыслаў КАРЛОВІЧ (1876 — 1909) — кампазітар. Нарадзіўся ў Вішневе на Смаргоншчыне. Сын славутага этнографа і музыколага Яна Карловіча. Вучыўся ў Германіі, жыў у Варшаве, дзе заснаваў свой аркестр. Займаўся грамадскай дзейнасцю, узначальваў Варшаўскае музычнае таварыства, з'яўляўся арганізатарам суполкі маладых польскіх кампазітараў. Сябраваў з Францішкам Багушэвічам. Аўтар шэрага песень і інструментальных твораў. Трагічна загінуў у 1909 годзе падчас адпачынку ў Закапанэ.

(Працяг на стар. 5)

Святочны дзень для ўсёй краіны

Дзень беларускага пісьменства лічаць сваім святам кнігавыдаўцы і кнігадрукары, распаўсюджвальнікі друку, паліграфісты. Але найперш — гэта дзень ушанавання прыгожага мастацкага слова. Пра ўдзел творцаў у Дні беларускага пісьменства распавядае старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ.

— Апошнімі гадамі свята пісьменства сталі больш знітоўваць са словам "пісьменнік". І гэта правільна. Трэба аддаць належнае і ўраду Беларусі, і Міністэрству інфармацыі краіны, якія надалі падтрымцы творцаў асаблівае значэнне.

Свята пісьменства для нас — насамрэч свята, якое адзначае ўвесь народ. У ім прымаюць удзел не толькі мясцовыя жыхары, а і госці з многіх краін свету і, натуральна, з усіх куткоў нашай краіны.

Чым адрозніваецца сёлетняе свята ад мінулага? Тым, што пісьменнікі будуць яшчэ больш адзначаны. Як вядома, СПБ сумесна з міністэрствамі інфармацыі, культуры і адукацыі Беларусі, а таксама Мінскім гарвыканкамам праводзіць конкурс на лепшы твор года. Праўда, адзначаем мы творцаў за лепшыя кнігі, выдадзеныя летась. Атрымліваецца, што праходзіць амаль 9 месяцаў па сканчэнні года, але затое мы маем магчымасць азнаёміцца з усім, што выдадзена апошнім часам. Сёлета падводзіліся вынікі за 2008 год, і на галоўнай пляцоўцы свята будуць адзначаны дыпломамі лепшыя творы і ўручаны прызы.

Летась у Барысаве мы ўзнагароджвалі намінантаў толькі за першыя месцы, а сёлета супольна з Міністэрствам інфармацыі Беларусі мы ўзнагародзім усіх пераможцаў: за першае, другое і трэцяе месцы. Гэта крыху больш часу зойме ў агульным сцэнарыі свята, але мы ўсё ж знайшлі такую магчымасць ушанаваць працу літаратараў. І нават заснавалі ў гэтым годзе заахвочвальныя дыпломы. Да таго ж, упершыню мы выступаем у супрацоўніцтве з Беларускім саюзам кампазітараў, які ўзначальвае Ігар Лучанок: будуць уручацца ўзнагароды лепшым стваральнікам песень — аўтару слоў, кампазітару і выканаўцу. Калі гаварыць пра конкурс, то падвядзенне вынікаў было даволі бурным, былі і крыўды, і радасці. Старшынёй журы з'яўляўся намеснік міністра інфармацыі Ігар Лапцёнак. Ведаеце, нават так атрымалася, што ў адной з намінацый мы не прысудзілі першае месца выдатнейшаму пісьменніку, які па праве прэтэндаваў на яе, але твор не ўпісваўся ў рамкі намінацыі: умовы ёсць умовы, і трэба быць аб'ектыўнымі.

Трэба сказаць, што мы знайшлі разуменне ва ўрадзе, калі давялося ўносіць некаторыя змены ў Палажэнне аб конкурсе; адзначу ініцыятыўную працу Міністэрства інфармацыі Беларусі і працу ўладаў на месцах, якія дапамагаюць пісьменнікам дабрацца да сталіцы свята (адлегласці немалыя, толькі ад Мінска каля 130 км). Думаем, што ўсё гэта дазволіць правесці святочны дзень на добрым узроўні.

У Барысаве мы радаваліся таму, што пісьменнікі ўдзельнічалі ў свяце не самі па сабе, а калектывамі: былі прадстаўленыя пісьменніцкія арганізацыі з усіх куткоў нашай краіны. Сёлета прынята рашэнне не столькі павялічваць колькасць удзельнікаў (зразумела, размова ідзе і пра эканомію сродкаў), колькі нейкім чынам поўна прадставіць арганізацыю: будуць прысутнічаць па 10 чалавек ад кожнай вобласці і 30 чалавек ад Мінска.

Характэрным з'яўляецца тое, што цяпер нашы пісьменнікі будуць на ўсіх арганізаваных мерапрыемствах. Дзесьці гэта будзе свята паэзіі, дзесьці іншыя падзеі, прымеркаваныя да пэўнай даты. Мы пабываем у музеі-сядзібе Ф.Багушэвіча. Там, напэўна ж, скажуць сваё слова і паэты, і празаікі. Магчыма, прагучаць песні.

Запланаваны і ўдзел пісьменнікаў у агульным шэсці. Але, думаю, не гэта галоўнае. Важна сустрэцца з чытачом, з жыхарамі Смаргоні і гасцямі свята. Пагутарыць, паслухаць людзей. Пабываць там, дзе будуць прадавацца кнігі пісьменнікаў, дзе творцы змогуць пакінуць свае аўтографы, адказаць на пытанні, расказаць пра задумы. Плануюцца выступленні пісьменнікаў у дзіцячых калектывах, сустрэчы з моладдзю.

І яшчэ важны момант. Ёсць найцікавейшыя асобы, пра якіх мы раней не ведалі і пра якіх мы проста абавязаны сказаць людзям: сумесна з гісторыкамі, вучонымі вярнуць іх імёны ў Беларусь. Да прыкладу, ніхто не ведае, што прабацькам мульткіно быў беларус Уладзіслаў Старэвіч. І ён варты таго, каб дошка з адпаведным надпісам з'явілася, прыкладам, на нашай кінастудыі. Ён зрабіў рэвалюцыю ў кіно, яго лічылі амаль чараўніком! Некалькі краін лічылі яго сваім, на самай жа справе ён родам з Беларусі. Цікавая гісторыя яго вынаходніцтва. Ён заваёўваў прызы і ў Парыжы, здзіўляў увесь свет. Дык вось, імёнаў, якія патрабуюць нашай увагі, мы ведаем каля 1,5 тысячы. Пісьменнікі ў гэтым плане могуць падняць такі пласт літаратуры! І можам шмат чым дапамагчы ў папаўненні гісторыі Беларусі.

Запісала Ірына ТУЛУПАВА

Конкурс «Лепшы твор 2008 года»

Зазвычай у першую нядзелю верасня на галоўнай сцэне свята ўшаноўваюцца лаўрэаты штогадовага Рэспубліканскага конкурсу "Лепшы твор года". Пра вынікі конкурсу штотыднёвіку "ЛіМ" распавёў першы сакратар СПБ Віктар ПРАЎДЗІН.



— Конкурс праводзіцца супольна Саюзам пісьменнікаў Беларусі, міністэрствамі інфармацыі, адукацыі і культуры і Мінгарвыканкамам. Трэці год запар мы падводзім вынікі конкурсу і бачым, якая вялікая ідзе літаратурная праца. І пісьменнікаў, і крытыкаў, і літаратуразнаўцаў.

У намінацыі ***"паэзія"*** першае месца прысуджана за кнігу "За плотью слов" Валянціне Паліканінай (выдавецтва "Мастацкая літаратура"). Некалькі разоў мы ставілі на перагаласоўку, але вынік атрымаўся адзін і той жа. Першае месца ўзяла Валянціна Паліканіна, другое — Міхась Пазнякоў за кнігу "Святое правіла" (таксама "Мастацкая літаратура") і трэцяе — Навум Гальпяровіч за кнігу "Насцеж" (выдавецтва "Мастацкая літаратура").

У намінацыі ***"проза"*** вызначана першае месца за кнігу "Старыя званы" Івана Канановіча (выдавецтва "Мастацкая літаратура"). Другое месца атрымала Валянціна Кадзетава за кнігу прозы "Шкляная зорка" (выдавецтва "Мастацкая літаратура") — творца з Гомельшчыны. Яе выданне шчырае па сваёй напоўненасці, з нечаканымі знаходкамі.

У выдавецтве "Харвест" выйшла ў 2008 годзе рускамоўная кніга "Цвела, цвела черёмуха", яе аўтар Мікалай Ільінскі атрымае трэцюю прэмію.

Што да намінацыі ***"дзіцячая літаратура"***, то аднагалосна першае месца аддадзена кнізе Уладзіміра Мазго "Цуда-вуда" (выдавецтва "Мастацкая літаратура"). Другое месца — "Казкі з гербарыя" Раісы Баравіковай (РВУ "Літаратура і Мастацтва"). І трэцяе — "Староначкі з моўнай скарбоначкі" Уладзіміра Мацвеенка.

Далей разглядаліся намінацыі, якія маюць толькі адно, першае месца.

"Літаратурная крытыка і літаратуразнаўства". Першае месца — кнізе "Сцежкамі Ігуменшчыны" Алеся Карлюкевіча (выдавецтва "Беларусь"). Тут падчас працы журы выявіліся недахопы наяўных умоў конкурсу. Да літаратурнай крытыкі як намінацыі аднесці кнігу "Сцежкамі Ігуменшчыны", цалкам нельга. Але ў нас вельмі шмат кніг па літаратуразнаўстве. І яны застаюцца практычна па-за ўвагай конкурсу. Таму мы ўнеслі адпаведныя змены ў Палажэнне аб конкурсе і намінацыя пашырылася.

"Публіцыстыка". Першае месца аддадзена Алесю Бадаку за кнігу: "Усім пра ўсё. Расліны". Выдавецтва "Літаратура і Мастацтва".

"Сатыра і гумар". Пераможцай стала кніга "Хор болей не спявае" (выдавецтва "Мастацкая літаратура") Міколы Шабовіча. Афармленне Алега Карповіча.

У намінацыі ***"драматургія"*** перамагла Наталля Пусцільнік-Марчук з п'есай "Тётушка Простуда и Новый год". Яна пастаўлена ў Беларускім рэспубліканскім тэатры юнага гледача ў 2008 годзе.

"Гістарычна-краязнаўчы жанр". Ён упершыню прысутнічае сярод намінацый у гэтым годзе. Цяпер у кожным мястэчку, раёне збіраюцца звесткі пра свае адметныя куточкі, пра інструменты і прылады з усяго наваколля, пра тое, як нашы продкі жылі, выжывалі. Самі ткалі, самі пяклі, самі цеслярамі былі. Вельмі цікава наведваць краязнаўчыя музеі, пра гэта шмат пішуць. Калі ўлічыць, што гістарычны кірунак у пісьменстве вельмі блізкі да краязнаўчага, мы вырашылі пакуль што аб'яднаць іх у адну намінацыю і яе нам сёлета зацвердзілі як "гістарычна-краязнаўчы жанр". На разгляд журы была прадстаўлена кніга "Радимичи. Земля непокорённая" Наталлі Голубевай (выдавецтва "Мастацкая літаратура"). Выдавецтва Беларускага Экзархата перавыдала дзесяцітысячным тыражом гэту кнігу. Такім чынам, першае месца аддадзена Н. Голубевай.

Другі раз сёлета падвялі вынікі ***песеннага жанру***. Першае месца атрымаў Андрэй Скарынкін за стварэнне цыкла песень, такіх, як "Молитва", "Плач журавлей", "Святаруссия". На шматлікія яго тэксты музыку напісаў Алег Хадоска, выканаўца песень Рыгор Палішчук. Але конкурс наш літаратурны, таму найперш ацэньваецца праца літаратара, паэта, а кампазітар і выканаўца становяцца лаўрэатамі нашага конкурсу. Другое месца — у Надзеі Салодкай за цыкл песень, прысвечаны Году роднай зямлі. Трэцяе аддадзена Леаніду Крываносу за цыкл песень "Мы служили с тобой на границе".

Запісала Ярына РЫТАМІНСКАЯ

(Працяг. Пачатак на стар 4)

Тамаш ГРЫБ (1895—1938) — грамадска-палітычны дзеяч, пісьменнік, публіцыст. Нарадзіўся ў вёсцы Паляна на Смаргоншчыне. Вучыўся ў Пецярбургскім псіханеўралагічным інстытуце, потым у Пражскім Карлавым універсітэце. Абараніў доктарскую дысертацыю «Пытанне народа і нацыі». Адзін з ініцыятараў стварэння і кіраўнікоў Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Не раз арыштоўваўся польскімі ўладамі. Браў удзел у працы замежнага бюро БПСР, быў адным з арганізатараў Беларускага навуковага кабінета, Беларускага культурнага таварыства імя Ф. Скарыны, Аб'яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый у міжваеннай Чэхаславакіі. Выдаваў газеты «Грамадзянін», «Сялянская доля», часопіс «Іскры Скарыны».

Віктар ШУТОВІЧ (1890—1960) — каталіцкі святар, пісьменнік, публіцыст. Нарадзіўся ў вёсцы Шутавічы, што на Смаргоншчыне. Скончыў Віленскую каталіцкую духоўную семінарыю, два курсы Пецярбургскай каталіцкай духоўнай акадэміі. Працаваў святаром у розных парафіях былой Заходняй Беларусі. Распаўсюджваў сярод вернікаў беларускія рэлігійныя і свецкія выданні, перыёдыку. Арганізаваў некалькі беларускіх школ.

Янка ШУТОВІЧ (1904—1973), літаратуразнаўца, публіцыст, рэдактар, выдавец, грамадскі дзеяч. Нарадзіўся ў вёсцы Шутавічы, што на Смаргоншчыне. Скончыў Віленскую беларускую гімназію, юрыдычны факультэт Віленскага універсітэта імя С. Баторыя. Уваходзіў у склад кіраўніцтва Беларускага студэнцкага саюза, Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. Рэдагаваў часопіс «Студэнцкая думка», літаратурна-навуковы квартальнік «Калоссе».

Уладзіслаў ЧАРНЯЎСКІ (1916 — 2001) — каталіцкі святар, перакладчык, паэт, мемуарыст. Нарадзіўся ў засценку Амбружына, непадалёк ад мястэчка Гальшаны. Род Чарняўскіх паходзіць з вёскі Біцяняты Смаргонскага раёна. Аўтар публіцыстычных артыкулаў, вершаў, успамінаў. Пераклаў кнігі: «Катэхізмоўка», «Кніга роду Біблія» (1997), «Біблія. Пяцікніжжа» (2002) і іншыя.

Віктар РОЎДА (1921 — 2007) — харавы дырыжор. Нарадзіўся ў горадзе Смаргонь. У 1939 годзе скончыў Віленскую дзяржаўную духоўную семінарыю, у 1951 годзе — Літоўскую кансерваторыю. З 1951 года выкладаў у Маскоўскай кансерваторыі, быў хормайстрам Дзяржаўнага акадэмічнага рускага хору СССР пад кіраўніцтвам А. Свешнікава. З 1956 года — хормайстар і дырыжор Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы Беларусі, адначасова выкладаў (з 1964 года — загадваў кафедрай) у БДАМ. З 1965 года з'яўляўся мастацкім кіраўніком і галоўным дырыжорам Акадэмічнага хору Беларускага тэлебачання і радыё. Народны артыст СССР і Беларусі. Памёр у 2007 годзе.

Арсень ЛІС (1934 г. н.) — літаратуразнаўца, фалькларыст, паэт. Нарадзіўся ў вёсцы Вётхава Смаргонскага раёна. Скончыў Смаргонскую сярэднюю школу, філалагічны факультэт БДУ. Выкладаў мову і літаратуру ў Шаркаўшчынскай сярэдняй школе, загадваў педагагічным кабінетам Шаркаўшчынскага рана. Быў рэдактарам Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі. З 1962 года — навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Доктар філалагічных навук. Жыве ў Мінску. Аўтар кніг «Браніслаў Тарашкевіч» (1966), «Мікола Шчакаціхін» (1968), «Пётра Сергіевіч» (1970), «Купальскія песні» (1974), «Пякучай маланкі след» (1981), «Вечны вандроўнік» (1984), «Песню ў спадчыну» (1989), «Цяжкая дарога свабоды» (1994) і інш.

(Працяг на стар. 16)

Устойлівая традыцыя ў святкаванні Дня беларускага пісьменства прасочваецца ад аднаго свята да наступнага. Ёсць шмат мерапрыемстваў, без якіх восеньская трыбуна беларускага красамоўства не абыходзіцца. Пра іх добра ведаюць і літаратары, і госці ўрачыстасцей. А вось пра той каларыт, які дадасць у сёлетняе свята Смаргоншчына, мы гутарым з начальнікам аддзела культуры Смаргонскага райвыканкама Таццянай РАЖЭВАЙ.

Мы багатыя на помнікі архітэктуры

Цэнтр горада — гэта даволі працяглая вуліца, яна ідзе ад сквера ў цэнтры горада да самога помніка Багушэвічу. На ёй будуць тры асноўныя пляцоўкі. Па-першае, на плошчы будзе ўсталявана вялікая сцэна для адкрыцця свята. Да таго ж, летась у нас з'явіўся амфітэатр, які знаходзіцца паміж царквой і касцёлам, месцазнаходжанне яго досыць цікавае: сцэна як быццам на выспе, на адным беразе ракі, а гледачы на другім беразе, паміж сабой яны звязаны масткамі...

— Перад рабочай сустрэчай з рэжысёрам свята мы распрацавалі шэраг сваіх прапаноў. Так, свята плануецца на 5 і 6 верасня. У суботу распачнецца навукова-практычная канферэнцыя, якую ладкуе Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, яе Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы.. І — адбудзецца III міжнародны форум "Мастацкі тэкст як сродак зносін народаў", арганізатарамі якога з'яўляюцца Міністэрства інфармацыі Беларусі, РВУ "Літаратура і Мастацтва" і рэдакцыя часопіса "Нёман".

— І ўсё ж, што стане візітоўкай Смаргоні на гэтым свяце?

— Будзе ўстаноўлены і адкрыты помнік Францішку Багушэвічу. Ідэя помніка ўзнікла ў 1990-я гады, тады быў аб'яўлены конкурс, які праходзіў у два этапы: у Смаргоні і Мінску. Пераможцам стаў скульптар Леў Гумілеўскі. Але праект не быў рэалізаваны. А вось калі пачалі рыхтавацца да Дня пісьменства, мы той праект вярнулі да жыцця. Асоба Ф. Багушэвіча стане адной з цэнтральных на свяце, помнік — месцам наведванняў для ўсіх, хто прыязджае да нас. Месца ў гарадскім парку выбрана для яго невыпадковае. Думаю, калі мы адкрываем помнік Багушэвічу, то гасцям свята будзе цікава наведаць і яго сядзібу.

Уручэнне прэмій лаўрэатам Рэспубліканскага конкурсу на лепшы літаратурны твор і лаўрэатам конкурсу "Залаты фаліянт" плануецца ў нашым амфітэатры. Шмат дзе разгорнуцца фальклорныя дзействы сіламі калектываў Смаргонскага раёна і Гродзенскай вобласці. Увогуле ў нас 21 калектыў са званнямі "народны" і "ўзорны". Гэта немалая колькасць для раёна. Калектывы харэаграфічныя, харавыя, народнай музыкі, фальклорныя, тэатр лялек "Батлейка". Ёсць спецыялізаваная школа імя М. Кл. Агінскага. Акрамя музычных кірункаў там ёсць мастацкае аддзяленне, дзе дзеці вучацца маляваць, харэаграфічнае і эстраднае. У школе два ўзорныя і тры народныя калектывы. Школа вялікая, больш як 600 вучняў навучаюцца. І вынікі добрыя.

— Дзве пляцоўкі, на якіх будуць разгортвацца дзействы, — гэта цэнтр горада і вёска Кушляны. А якія яшчэ?

— Цэнтр горада — гэта даволі працяглая вуліца, яна ідзе ад сквера ў цэнтры горада да самага помніка Багушэвічу. На ёй будуць тры асноўныя пляцоўкі. Па-першае, на плошчы будзе ўсталявана вялікая сцэна для адкрыцця свята. Да таго ж, летась у нас з'явіўся амфітэатр, які знаходзіцца паміж царквой і касцёлам, месцазнаходжанне яго досыць цікавае: сцэна як быццам на выспе, на адным беразе ракі, а гледачы на другім беразе, паміж сабой яны звязаны масткамі...

— Згадваецца творчая задума тэатра Уршулі Радзівіл...

— Так, і вытрыманы прынцып грэчаскага тэатра, калі сцэна знаходзіцца ніжэй, а гледачы крыху вышэй.

У гарадскім парку будзе працаваць горад майстроў, ёсць для гэтага прыстасаванні. Наш сабор, які будаваўся больш як дзесяць гадоў і мае цяпер вабны выгляд, таксама па сваім прызначэнні стане цэнтрам духоўнасці. Экспедыцыя "Дарога да Святыняў" з Добрадатным Агнём ад Труны Гасподняй, якая пройдзе праз Смаргонскі раён, асвеціць Іерусалімскім агнём і гэты адбудаваны сучасны праваслаўны храм.

У нашым каталіцкім касцёле ёсць закрытая маладзёжная пляцоўка з вельмі добрай акустыкай. Мы задумалі там правесці канцэрт духоўнай і класічнай музыкі. Дарэчы, усе нашы калектывы рыхтуюцца паказаць сябе на розных пляцоўках. Момант шэсця, дзе плануецца тэатралізаваная дзея, будуць упрыгожваць таксама нашы калектывы.

Спадчына ў нас даволі багатая. І тых, хто пакінуў свой след у гісторыі, і сучасных аўтараў. Выдадзены зборнік "Смаргоншчына літаратурная" — па яго ўкладанні вялікую працу правяла цэнтральная бібліятэка Смаргонскага раёна і Генадзь Пашкоў, наш зямляк. А калі гаварыць пра Смаргонь турыстычную, то мы маем вельмі вялікі пласт гісторыі, што дазваляе, да прыкладу, стварыць мемарыяльны комплекс па лініі супрацьстаяння ў Першую сусветную вайну. Усё-такі тут — 810 дзён абароны і першае прымяненне газавай атакі на нашай тэрыторыі. Праект ствараецца пры дапамозе Саюзнай дзяржавы.

Мы багатыя і на помнікі архітэктуры. Распрацавана так званае залатое кола Смаргоншчыны, якое ўключае Крэўскі замак, сядзібу М. Кл. Агінскага ў Залессі, якая закансервавана, але турысты туды прыязджаюць, у Жодзішках ажно тры помнікі — Радзішкоўскі касцёл, іезуіцкі калегіум і вадзяны млын, які працуе і можна паглядзець, як ідзе памол мукі. І важны аб'ект у гэтым залатым коле — сядзіба Ф. Багушэвіча ў Кушлянах.

Канечне, будзем старацца зрабіць так, каб свята пакінула свой след у душах тых, хто сюды прыедзе.

Ірына ТУЛУПАВА

На здымках: начальнік аддзела культуры Смаргонскага райвыканкама Таццяна Ражэва; Смаргонскі амфітэатр.

Фота аўтара

Пагартаем летапіс...

Кастрычнік 1503 г. Першае пісьмовае ўпамінанне пра Смаргонь у дакументах па гісторыі Віленскай епархіі (Юрыем Зяновічам быў пабудаваны касцёл св. Мікалая).

1553 — 1555 гг. У Смаргоні пабудаваны мураваны Кальвінскі збор.

1590 г. Мікалай Багуслаў (Крыштоф) Зяновіч заснаваў у Смаргоні папяровую мануфактуру, якая вырабляла паперу для Віленскіх друкарняў.

Жнівень 1609 г. У Смаргоні спыніўся кароль Польскі і Вялікі князь Літоўскі Сігізмунд III падчас яго паходу на Маскву.

1621 г. Кальвінскі збор перададзены католікам і атрымаў назву Троіцкага касцёла.

1628 г. Смаргонь пераходзіць ва ўладанне князёў Радзівілаў (Ганна Соф'я Зяновіч выйшла замуж за Альбрэхта Уладзіслава Радзівіла).

Чэрвень 1655 г. У Смаргоні знаходзілася стаўка рускага цара Аляксея Міхайлавіча, бацькі Пятра I, падчас яго паходу на Вільню.

11 лютага — 17 сакавіка 1708 г. У Смаргоні размяшчаецца галоўная кватэра шведскага караля Карла XII падчас Паўночнай вайны (1700 — 1721 гг.).

1762 — 1790 гг. Уладаром Смаргоні быў Караль Станіслаў Радзівіл, "Пане Каханку", з дзейнасцю якога звязаны росквіт школы дрэсіроўкі мядзведзяў — "Смаргонскай акадэміі" (існавала з XVII да пачатку XIX ст.).

XVII — XIX стст. У Смаргоні атрымала вялікае распаўсюджванне вытворчасць "абваранак" (абаранак), радзімай якіх яна лічыцца.

1795 г. Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай Смаргонь увайшла ў склад Расійскай імперыі.

1805 г. Князь Багдан Агінскі купіў Смаргонь за 65000 злотых.

1808 г. Уладаром Смаргоні становіцца граф Караль Пшаздзецкі.

5 снежня 1812 г. Імператар Напалеон пакінуў сваю армію ў Смаргоні, перадаўшы камандаванне маршалу Мюрату.

1832 г. На мястэчка Смаргонь, як уладанне К. Пшаздзецкага (за яго ўдзел у паўстанні 1830 — 1831 гг.), накладзены секвестр, і яно здаецца ў арэнду.

1842 г. Смаргонь перайшла ў склад дзяржаўнай маёмасці.

1873 г. Праз горад пракладзена Лібава-Роменская чыгунка, будаўніцтва якой зрабіла вялікі ўплыў на прамысловае развіццё Смаргоні.

1879 — 1904 гг. Смаргонь — казённае фабрычнае мястэчка, цэнтр аднайменнай воласці Ашмянскага павета Віленскай губерні.

1893 г. У Ашмянскім павеце ўзнікла першая рабочая арганізацыя — "Саюз рабочых Смаргоні" пад кіраўніцтвам С.С. Трусевіча, І.Ф. Сініцкага, П.А. Гільмана.

1901 г. Смаргонская стачка — найбольш значнае выступленне пралетарыяту Беларусі на пачатку XX ст. Яна ахапіла да 1300 рабочых 26 гарбарных заводаў і майстэрняў і працягвалася каля 4-х тыдняў.

1901 — 1904 гг. У Смаргоні былі праведзены 31 эканамічная і 3 палітычныя стачкі, 2 дэманстрацыі, 13 масовак, адбыліся дзве сутычкі рабочых з паліцыяй.

6 чэрвеня 1904 г. Імператар Мікалай II зацвердзіў рашэнне Кабінета Міністраў аб узвядзенні мястэчка Смаргонь у статус беспавятовага горада.

1905 — 1907 гг. Пралетарыят Смаргоні прымае актыўны ўдзел у першай расійскай рэвалюцыі.

1914 г. Горад Смаргонь Ашмянскага павета Віленскай губерні налічвае 16228 жыхароў.

Верасень 1915 г. — лістапад 1917 г. Гераічная абарона Смаргоні падчас першай сусветнай вайны. Часопіс "Огонёк" у 1916 г. называе Смаргонь "мёртвым горадам".

18 сакавіка 1921 г. Згодна з Рыжскім мірным пагадненнем Смаргонь увайшла ў склад Польскай дзяржавы. У горадзе налічвалася 154 жыхары.

17 верасня 1939 г. Смаргонь уваходзіць у склад БССР.

15 студзеня 1940 г. Смаргонь — цэнтр Смаргонскага раёна Віленскай вобласці.

25 чэрвеня 1941 г. — 4 ліпеня 1944 г. Смаргонь акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Верасень 1944 г. Смаргонь — цэнтр Смаргонскага раёна Маладзечанскай вобласці.

20 студзеня 1960 г. Смаргонскі раён пераходзіць у склад Гродзенскай вобласці.

1972 — 1976 гг. Уведзены ў строй заводы аптычнага станкабудавання, сухога абястлушчанага малака, камбікормавы, ільнозавод.

4 красавіка 1983 г. Пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР у Смаргоні пачынаецца будаўніцтва філіяла Мінскага трактарнага завода імя У.І. Леніна.

1985 г. Смаргонь выдзелена ў асобную адміністрацыйную адзінку абласнога падпарадкавання.

Лістапад 1996 г. Згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Смаргонскі раён і г. Смаргонь аб'яднаныя ў адну адміністрацыйную адзінку — Смаргонскі раён.

2003 г. Смаргонь адзначыла 500-годдзе.

2006 — 2007 гг. За дасягненне лепшых вынікаў у выкананні асноўных мэтавых паказчыкаў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Смаргонскі раён занесены на Рэспубліканскую Дошку гонару.

Віктар КАВАЛЁЎ

Зоркі Смаргоншчыны

"Злосна вам, сыны заморскі, завідна, панята!
Што славянская зямелька у розум багата;
Вы б хацелі ўсе розумы — і свае і нашы,
Маўляў саранча на ніве, паесці у кашы,
Не даждання ж, мудрагелі! — і нашая ніва
Вялікімі дударамі уздаволь шчасліва!
Біця ж чалом тром сакалом, хлапцы, маладзіцы!
Гэта ж кветкі з свойскай веткі, Славянскай зямліцы!"

Вінцэнт ДУНІН-МАРЦІНКЕВІЧ
(з "Верша Навума Прыгаворкі")

Для выдавецтва "Мастацкая літаратура" ўжо стала добрай традыцыяй напярэдадні Свята беларускага пісьменства выдаваць кнігу літаратараў таго раёна, дзе яно праводзіцца. Сёлета свята адбываецца на Смаргоншчыне, зямля якой не абдзелена талентамі з даўніх часоў. Яркія гістарычныя імёны, слынныя постаці і мастацкія творы запоўнілі старонкі гэтай гожа выдадзенай кнігі! Вельмі прыемна, што адчуванне гонару за свой край зыходзіць са слоў кіраўніка раённай адміністрацыі, старшыні Смаргонскага раённага выканаўчага камітэта М. Гоя, напісаных ім ва ўступным артыкуле, дзе ён, між іншым, зазначае, што *"не толькі слаўнымі і гераічнымі справамі славіцца і ганарыцца смаргонская зямля. Не меншую вядомасць яна займела дзякуючы сваім славутым мастакам, музыкантам, пісьменнікам. Рэдкая мясціна Беларусі можа пахваліцца такой незлічонай колькасцю выдатных і таленавітых паэтаў, празаікаў, драматургаў і мемуарыстаў"*.

І напраўду, далучанымі да гісторыі Смаргоншчыны былі знаныя ў Беларусі людзі: вядомы дыпламат і кампазітар Міхал Клеафас Агінскі, пісьменнік і мемуарыст Ігнат Ходзька, пісьменніца і калекцыянер Габрыэля Пузына, вядомы этнограф і фалькларыст Ян Карловіч, класік роднай літаратуры Францішак Багушэвіч, паэт-рэвалюцыянер Адам Гурыновіч...

Ды і цяпер вядомых творцаў са Смаргоншчыны не менш — гэта вучоны-літаратуразнаўца Арсень Ліс, дыпламат і пісьменнік Уладзімір Шчасны, паэты Уладзімір Някляеў і Мар'ян Дукса, Алесь Жамойцін і Ала Клемянок...

Каб сабраць пад адной вокладкай столькі яркіх імён, трэба і самому быць адмыслоўцам у справе краязнаўства. Смаргонцам пашчасціла, што ўкладальнікам кнігі "Колькі ў небе зор..." стаў маладзечанец Міхась Казлоўскі, вядомы збіральнік і захавальнік літаратурнай спадчыны, выдавец "Куфэрка Віленшчыны". Пашанцавала і на дасведчанага, па-добраму ўедлівага рэдактара, Юрася Пацюпу. Адсюль так згарманізаваныя і дастаткова чыста адабраныя тэксты і ёмкія біяграфічныя звесткі ды каментарыі.

А пачынаецца кніжка, як і ўсялякая добрая справа, — са святога, з Евангелля паводле Яна ў перакладзе айца Уладзіслава Чарняўскага. Ёсць там такі фрагмент, дзе *"Ісус, павярнуўшыся і ўбачыўшы, што яны ідуць за Ім, кажа ім:*

«Што шукаеце?» Яны сказалі Яму: «Раббі, — што ў перакладзе значыць Настаўнік, — дзе жывеш?» Кажа ім: «Ідзіце і ўбачыце». Дык пайшлі і ўбачылі..."

Гэта па сутнасці глыбокая метафара, своеасаблівы зварот да чытачоў "Смаргоншчыны літаратурнай" — маўляў, хочаце ведаць сваіх творцаў і асветнікаў, дык едзьце на іх радзіму і там спраўдзіце свой досвед пра іх і глыбей пранікнецеся плёнам іх стваральнай працы і дзейнасці.

Хораша і запамінальна занатаваныя і апрацаваныя "Народныя абрады і звычаі на Смаргоншчыне" М. Клуйшам. Па сутнасці, запісаны поўны вясельны абрад (з рознымі варыянтамі песеннага фальклору), паводле якога можна, пры жаданні маладых, хоць сёння справіць адмысловае вяселле на даўні лад. Цікавымі падаюцца і "расшыфроўкі" паходжання назваў вёсак Смаргоншчыны, да прыкладу вёскі Войстам: *"Калісьці даўным-даўно ішла тут страшная бітва з татара-мангольскай ардой, шмат крыві пралілося, шмат людзей загінула, і тады застагнала зямля ад пакуты і гора... Кажуць людзі, калі надаралася праязджаць міма, толькі вой, толькі стогн чуцен быў здалёк. Гэта клікалі душы, стагнала зямелька, шкадуючы палеглых сыноў сваіх... І вёску завуць цяпер Войстам, так як бы назва складаецца з двух слоў "Вой" і "Стогн". (Паданне запісана ў Нінь Васільеўны Няпеўнай, в. Войстам.)"*.

Але, прынамсі мяне, найбольш уразілі мемуары "Мая біяграфія" М. Кл. Агінскага. Калі б сённяшнія маладзёны не тырчэлі на вуліцах з піўнымі бляшанкамі ў руках, а займаліся адукацыйнай і дзейнай справай па 16 гадзін у суткі, як тое рабіў падлеткам М. Кл. Агінскі, то мелі б іншыя ўяўленні пра грамадскае і чалавечае жыццё і выстройвалі б іншую перспектыву для сябе. Ды і сам я, пэўна, меўшы такое выхаванне і адукацыю ,пражыў бы сваё жыццё з большай для грамадства карысцю і запатрабаванасцю. А пра тое, што знакаміты паланез "Развітанне з Радзімай" не мог напісаць чалавек без глыбокага патрыятызму, гонару і годнасці, сведчыць наступны фрагмент з "Маёй біяграфіі" М. Кл. Агінскага : *"Да гэтага часу камісія скарбу Літвы паўтарала лёс іншых установаў Польшчы: яна слепа выконвала распараджэнні расейскага пасла, якія перадаваліся ім праз караля або аднаго з міністраў у Варшаве. Я быў першы, нягледзячы на мой малады век, хто дазволіў сабе ўзняцца супраць канкрэтнага ладу жыцця. Гаворка была пра біццё медных манетаў на суму мільён залатых. Я не ведаю, дзеля чаго міністр Расеі дамагаўся гэтага. Кароль і Неадменная Рада згадзіліся на гэтае патрабаванне і перадалі ў дзве камісіі скарбу парадак яго выканання. Калі ў Горадне, як звычайна, камісія мусіла разгледзець і падпісаць, я запрацівіўся гэтай прапанове, спасылаючыся на закон, які вызначае прапорцыю паміж меднай і сярэбранай манетай. Я даводзіў, што мы не маем права ўхіляцца ад гэтай дыспазіцыі закону і што гэтага адзінага доваду досыць, каб даць негатыўны адказ. Акрамя таго, паказаў усе нязручнасці, якія з гэтага вынікалі, і, між іншым, знясцэньванне манеты, як натуральны вынік гэтай пастановы. Улады не маглі адхіліць майго прадстаўлення, якое абапіралася на закон, але яны прапанавалі мне наступным разам маўчаць, перадаўшы на мой адрас ліст караля і галоўнага прэлата. Гэтыя два лісты не нагналі на мяне страху, але я не мог схаваць сваіх эмоцыяў, калі мне перадалі ліст майго бацькі, напісаны на просьбу галоўнага прэлата, каб пераканаць мяне адмовіцца ад свайго меркавання. Я занадта добра ведаў свайго бацьку, каб западозрыць яго ў намеры кіраваць маёй свядомасцю. Але няцяжка здагадацца, што гэты ход быў выкарыстаны, каб паўплываць на маю думку, таму разумеў, што спачатку хацелі прымусіць майго бацьку падпарадкавацца волі расейскага міністра, а тады дабіцца, каб я рабіў на яго прыклад. Я адчуў сапраўднае задавальненне, калі, распячатаўшы ліст майго бацькі пры сваіх калегах, знайшоў там наступныя словы: "Мне надакучаюць з усіх бакоў і ўжо многа дзён, каб я напісаў табе гэты ліст. Я яго перадаў у рукі галоўнага прэлата, які хацеў яго мець. Ты ведаеш заданні, ускладзеныя на цябе на той пасадзе, якую займаеш. Я лічу, што ты ў тым веку, калі ўмееш іх слушна ацаніць і выконваць. Не адступай ад шляху цноты і гонару. Пакладзіся на Бога, паважай законы, кіруйся ў дзеяннях сваім сумленнем. Найбольш моцная небяспека можа спалохаць тых, у каго не стае адвагі і энергіі, каб выконваць свае абавязкі"*.

Скарбнік Дзяконскі, як і мае калегі, быў вельмі здзіўлены, выслухаўшы гэты ліст, і з гэтага часу загады з Варшавы паступалі больш дакладныя, бо там з усіх сілаў хацелі правесці праект аб меднай манеце.".

Прабачаюся за вельмі доўгую цытату, але падумалася, што яна скажа сучаснаму чытачу незалежнай Беларусі больш істотнага, чым мае суб'ектыўныя развагі пра значнасць тых ці іншых апублікаваных тут твораў. Вядома, я і пра іх скажу, хоць больш сціпла і сцісла. Напрыклад, свежа і неардынарна прачыталіся вершы В. Дуніна-Марцінкевіча ў перакладах С. Сакалова ("Трэба кахаць!" і "Вандроўнік").

Калі б сённяшнія маладзёны не тырчэлі на вуліцах з піўнымі бляшанкамі ў руках, а займаліся адукацыйнай і дзейнай справай па 16 гадзін у суткі, як тое рабіў падлеткам М. Кл. Агінскі, то мелі б іншыя ўяўленні пра грамадскае і чалавечае жыццё і выстройвалі б іншую перспектыву для сябе.

Слушныя, асабліва па тым часе, думкі наконт творчасці выказаў у сваім артыкуле "Патрэба нацыянальнай ідэі" Вінцэнт Гадлеўскі, і адзін абзац з яго я працытую: *"Жывучы й працуючы ў сваіх собскіх варунках, чалавечая адзінка найлепш й найкарысней спаўняе свае заданні. У іншых, чужых варунках чалавек не можа гэтак выявіць сваіх здольнасцяў. Гэта адносіцца перш за ўсё да паэтаў, якія найлепш і найбольш твораць у роднай мове і ў роднай стыхіі, якая выплывае з іх натуры. Нашы некаторыя паэты, якія хоць і дзяржацца інтэрнацыянальных кірункаў, аднак патрапілі даць свайму народу дасканальныя творы, а гэта таму, што дзяржаліся сваёй нацыянальнай стыхіі. Магчыма, у чужой мове і ў чужых умовах яны не патрапілі б ані выявіць у той меры свайго таленту, ані абдарыць беларускага народу, а праз яго і ўсё чалавецтва сваімі творамі. Беларускі народ як жарало іхніх сілаў, беларуская стыхія як натхненне іхняга таленту, беларуская мова як спосаб выўлення іхняга творства, — усё гэта прычынілася да выканання імі сваёй жыццёвай ролі"*.

Цікавыя развагі, а для некаторых чытачоў, магчыма, і новы досвед адкрыюць у сваіх арыгінальных тэкстах Ян Станкевіч ("Беларускія мусульмане і беларуская літаратура арабскім пісьмом"), Тамаш Грыб ("Адвечны шлях — гэта ёсць шлях Скарыны"), Янка Шутовіч ("Успаміны пра Віленскую беларускую гімназію" і "Віленскі беларускі музей"), Вітаўт Тумаш ("Спрэчка пра дакументы, якіх ніколі не было"), Уладзіслаў Чарняўскі ("Мае ўспаміны"), Арсень Ліс ("Рыцар беларускай свабоды")...

Безумоўна, што і выдрукаваныя нізкі вершаў У. Някляева, М. Дуксы, Р. Семашкевіча і Г. Пашкова адназначна таленавітыя, настоены на высокім натхненні і вытрыманыя на выбітным мастацкім гусце. Вось, для прыкладу, цудоўныя радкі з верша "Сейбіты смутку" сённяшняга жыхара Солаў, паэта М. Дуксы, своеасаблівая элегія знішчаным хутарам дзяцінства і разам з тым аграрнай культуры і натуральнага сялянства агулам (рэха пасляваеннай калектывізацыі ў былых раёнах Заходняй Беларусі):

Як знепрытомнела
цёплае месца падворка,
як пахадзіла па ім
чорных д'яблаў гайня...
Тут недарэчная сёння
людская гаворка,
слоў не прымае,
не слухае іх цішыня.
.....
Птушак і тых не відаць
у аглухлым закутку,
птушак жальба
не пускае ў пустыя двары.
Папрацавалі вы здорава,
сейбіты смутку,
плачам заліўшы
панішчаныя хутары.
Ці прычакала вас
плата-расплата якая,
ці прытуліла нябесная
вас сінява?
І на магілах у вас
крапіва хутарская
ці не буяе —
удзячная вам крапіва?

Па-свойму запамінальная проза П. Савоські і рана адышоўшага з зямнога жыцця А. Цяжкага, па-свойму захапляе сюжэтным ходам гістарычная драма "Паланез на развітанне" У. Драздова (Шчаснага). Ды і самім **туташнім** смаргонскім аўтарам, дзякуючы пільнаму рэдактарскаму адбору, не давядзецца чырванець перад землякамі на свяце ў родным горадзе за свае выдрукаваныя ў кнізе літаратурныя творы. А сярод аўтараў — сучасныя жыхары Смаргоні: Я. Траццяк, С. Гаўрылкевіч, В. Вайцюль, А. Жураўлёў, Д. Ліс, А. Камінскі, Л. Рогач, Г. Каравай, І. Гаева, І. Лазута, Ю. Янушкевіч, Т. Скарынкіна, А. Пастарнак. Працытую з аптымістычнага кантэксту іх публікацый радкі з верша паэтэсы Веры Вайцюль, якая піша пра шчасце, маўляў, якое ж яно простае і звычайнае, калі яно... ёсць:

А шчасце ціхае маё
Са мною побач у кватэры:
Духмяны бохан на стале,
Верш недаспелы на паперы.
.....
На крылах раніцаю звонкай
Нясуць нябёсы жаўрукі.
Бялюткі шлейф —
цвіце чаромха,
Сто сонцаў — лотаць ля ракі.
Ці раптам лівень як з вядра.
Прыспешвае пара грыбная.
Выходжу ў клопатах з двара.
Іду. Пра шчасце не гадаю.

Як кажуць, дай Божа ўсім. Каб нават і тады, у свой невымоўны час кожны з нас мог выдыхнуць на роднай яму зямлі свае глыбока затаемленыя словы.

Такое чалавечае жыццё. Але грэх нам засмучацца ўласнай доляй. Таму, калі хто часам спытае: дзе найбольш зорнае неба? — дык смела кажыце, што — над Смаргоншчынай...

Леанід ГАЛУБОВІЧ

Аблічча беларускіх гарадоў і вёсак імкліва мяняецца — хто ж з нашых сучаснікаў гэтага не заўважае! І амаль кожны чалавек, сталеючы, з нейкім настальгічным пачуццём углядаецца і ў колішнія фотаздымкі, і ў зробленыя з натуры пейзажы, якія захоўваюць ужо зніклыя рысы на "партрэце" родных, ці проста знаёмых і дарагіх, мясцін. Асаблівую папулярнасць маюць выданні, што знаёмяць з даўнім архітэктурным абліччам роднай краіны.

Рэтра-матывы

Вядомы альбом Вячкі Целеша "Гарады Беларусі на старых паштоўках", які ўжо тройчы выходзіў у выдавецтве "Беларусь", змяшчае вось такую падборку відаў заштатнага горада ў Ашмянскім павеце, якім была Смаргонь у пачатку XX стагоддзя. Мінская вуліца завецца цяпер Савецкай і забудаваная пановаму; Рынкавая плошча, на якой справа размяшчаўся будынкак вольнага пажарнага таварыства, а над дрэвамі ўзвышаліся купалы Аляксандраўскай царквы, ператвораная ў плошчу Свабоды; Гарбарная — сёння вуліца Гастэлы; вакзальная прысада сярод палёў: на яе месцы вуліца Камсамольская з прыватнай пабудовай; сядзіба беларускага мемуарыста і падарожніка Івана Сініцкага, які заклаў сад на гарадской ускраіне, па вуліцы Мінскай (дом згарэў падчас Першай сусветнай вайны, некаторыя дрэвы старога саду збераглися).

Святлана БЕРАСЦЕНЬ



Святой зямлі куток...

Мар'ян ДУКСА

Ля руін Крэўскага замка

Час адгукніся, ў мінулае збеглы,
страчаны голас падайце, гады.
Бітая цэгла, бітая цэгла
густа засыпала вашы сляды.
З вамі як родныя мы паяднаны,
доўжыцца наш сіратлівы хаўрус.
Бітаю цэглаю параскіданы
ў памяці нашай мінулага друз.
Што мы вакол яго ходзім кругамі...
Выбрацца з круга — нам сіл не стае.
Колькі гадоў ужо ў нас пад нагамі
не брукаванка, а пыл паўстае.
Дзе тая ўзлётная моц баявая,
дзе той задзірысты кліч баявы?
Як трыумфальна мой дух забівае
непераможаны дух крапівы!
Не пахаваны часінай далёкай,
просіцца голас з зямной нематы.
Нават і сённяшняй ноччу глыбокай
нібы жывыя звіняць капыты.
Спіць пад руінамі слава былая,
ты ў каравуле над ёю пастой.
Нешта... А што да мяне прамаўляе
спадчыннік славы —
густы травастой?

Музыка Агінскага

1

У сонечнай купаюцца лагодзе
палеткі навакольныя і лес.
З былога паўзабытага стагоддзя
цячэ крыніцай чыстай паланез.
Душа жадае музыкі ягонай,
душа квітнее ад яго, як бэз.
Усё сціхае над зямлёй зялёнай,
калі гучыць тужлівы паланез.
Чароўная мелодыя ліецца
і запаўняе наваколле спрэс.
І жаўранкі тутэйшыя, здаецца,
выконваюць нябесны паланез.
Ах, колькі тут і роздумаў, і жалю!
А можа, кампазітар уваскрэс
і сёння ў небе, нібы ў ціхай зале,
натхнёна грае ўласны паланез.

2

Маўчанне зорак, ззянне сінявы,
шчаслівых птушак перазоў світальны,
дыханне ветру, пошумы травы —
усё ўвабраў наш творца геніяльны.
Усё, што красавала і расло,
усе былыя песні-адгалоскі...
І падарылі музыцы цяпло
святлістыя залескія бярозкі.
І аддала чуллівая зямля
ёй моц і гарт, каб вечна не сціхала.
І музыку пяшчотная Вялля
над залатым пяском ускалыхала.
Гады, як гусі, мчаць за небакрай —
няхай мацнее памяці падмурак.
Спявай і грай, увесь смаргонскі край —
калыска слынных вальсаў і мазурак.

Алесь ЖАМОЙЦІН

Шлях да радзімы

Ляцела братчына буслоў
Сярод чужых нябёс.
І раптам — бураю арлоў
На бойку лёс узнёс.

Унізе скалы, чужына,
Ні рэчак, ні бароў,
А на радзіме ўжо вясна,
Чакаюць там буслоў.

Буслянкі-сіраты стаяць
Без клёкатных размоў;
Няўжо і сеяць і збіраць
Там будуць без буслоў!?

А хто пад кожную страху
Прыбавіць немаўля?
Няўжо знямееш у граху,
Пакутная зямля?!.

Арлы упэўнена ляцяць,
У лёце смерці шык;
У жыцці заўсёды верх трымаць
З іх кожны ўжо прывык.

...Няроўны быў з арламі бой, —
Сусвет спаволіў рух, —
Ды кожны бачыў прад сабой
Буслянку, поле, луг;

І кожны ведаў: той зямлі
Ім нельга сіраціць,
Бо ёй, каб зваць зямлёй маглі, —
З бусламі разам быць!..

...Ляцела братчына буслоў
З крывавых тых нябёс
Да родных хат, да родных слоў,
Да вечнасці асноў...

Аддзячыць поле табе...

Аддзячыць поле табе, аддзячыць,
Ракою звонкай сваіх зярнят;
Яму вось толькі б адчуць і ўбачыць,
Што ты не знекуль, а з гэтых хат.

Што ты хадою не кінеш ценю,
Ў якім не ўзыдзе святло зямлі;
Што ты цяжкое збярэш каменне
З найсамай цвёрдай яго раллі.

Аддзячыць поле табе, аддзячыць,
Аддасць гарою калосны дар;
Яму вось толькі адчуць і ўбачыць,
Што ты не госць тут, а гаспадар!...

Рыгор СЕМАШКЕВІЧ

* * *

Недзе на Свірскім возеры
Дзікія гусі крычаць.
Скора ўжо, скора возьмецца
Неба іх калыхаць.

А можа, яны і бліжай?
Ды гэтага не відаць.
Цёмнач. І толькі праз цішу
Дзікія гусі крычаць.

Крычаць не таму, што дзікія.
Тут кожны пачаў бы крычаць,
Калі дарогі цяжкія, вялікія,
А даўно пара адлятаць.

Францішак Багушэвіч

Ніякія годы,
Паходы,
Нягоды
Ад нас не адрынуць той час.
ад скарбаў роднае зямлі
І світка мужыцкая днее пагодна —
Ашмянскага крою якраз.

Якія дакоры
Бываюць у гора?
Імжыць праз гады сіратлівы пагляд.
На ўсю Беларусь мільён пракураў
І толькі адзін, толькі ён адвакат.

Генадзь ПАШКОЎ

Укропенка

Дзень добры, вёсачка Укропенка!
Між агародаў і ляшчын,
спавітых туманом укропавым,
раку расплёскалі ляшчы.

Варушыць чорнае карчэўе
на водмелі цягучы глей.
Як старажытнае качэўе,
гумно распетрыў сухавей.

Гарбуз даўно ўжо гарбузуе:
назло гуркам і метлюкам,
пралезшы хітра праз паркан,
ён сенакосішча прасуе.

Над комінам заняўся дым,
час бульбу ставіць на вячэру,
саганчык похапкам адным
агонь траскучы ашчаперыў.

Бальшак вячэраю прапах.
На бульбе — кропавыя кропкі...
Смаргонь. А побач — сонны птах
паміж ляшчэўніку — Укропенка.

Мікола СІСКЕВІЧ-НАРАЧАНСКІ

У Смаргоні, ля герба князёў Радзівілаў

Вірыць і Оксна, і Гервятка.
Мой продак з Нарачы тут жыў...
Мянушкай казыраў спачатку
"Смургоньскі франт"...
А для нашчадкаў
На прозвішча яе змяніў.

У акадэміі мядзведжай,
Казалі, важным чынам быў.
Даваў чатырохногім ежу
І далікатнасці вучыў.

Браў звера чорнага за лапу,
З ім тросся скокам у лапцях
І "абвараначкі" у зяпу
Клаў жменямі, каб не зачах.

Іх нарачанскі волат "няньчыў", —
Гнаў на спачын і ў стайню-хлеў.
Хлапчына спрыт і сілу меў, —
З мядзведзіцай прывабна танчыў,
З дзяўчатамі таго не ўмеў.

...Былі ў спадарстве й Радзівілы,
Шмат хто ўладарыць тут хацеў.
Ды водбліск тых гадоў застылых
Сюды, бы рэха, даляцеў.

Нішто сляды падзей не змыла.
Да каранёў яны вядуць.
Суладна продкі Радзівілаў
І на Смаргоншчыне жывуць.

Праз адзвінеўшыя сутонні
Не ўсё былое зразумець...
Стагоддзі адлічыў Смаргоні
Дарунак княжацкі — мядзведзь.

Дзівосны герб не зганьбаваны.
На ім яму шчэ доўга жыць.
Людзьмі смаргонскімі прызнаны, —
Нікім ушчэнт не зруйнаваны,
Хай зоркай памятнай гарыць.

...Шчыток сярэбранага поля...
Рашоткі чырвань і мядзведзь.
Шкада! Лясны жыхар ніколі
На герб не зможа паглядзець.

Аркадзь НАФРАНОВІЧ

Свята роднага слова

Дыпціх

1.

Дзень беларускага пісьменства —
Кніг мора, прыгажосць кругом.
У ім так многа падабенства
З Днём Ведаў — самым светлым днём.

Перапаўняе радасць сэрца,
Бо ты шчыруеш на сяўбе.
Шмат думак пра жыццё снуецца,
І пазнаеш наноў сябе.

Пяе душа, настрой лагодны,
На ўсім святочнасці пячаць.
І нашай мовы, самай роднай,
Гучанне мілае чуваць.

Я — беларус. І мову гэту
Да скону дзён мне берагчы.
У ёй жа для пазнання свету
Усе патрэбныя ключы.

Як лёгкім кісларод, заўсёды
Яна патрэбная так мне.
У ёй залог маёй свабоды,
З чаго і радасць удвайне.

А моў, як і народаў, многа.
І лепшых, горшых з іх — няма.
І, знаць, гавораць нездарма,
Што мова дадзена нам Богам.

Будзь гараджанін ты, вясковец,
Ні ў свеце, ні ля родных стрэх —
Нідзе не грэбуй сваёй мовай,
Бо гэта найвялікшы грэх.

О роднае святое слова! —
Мая і радасць, і любоў.
З ім, бачыць Бог, невыпадкова
Сябе, як чалавек, знайшоў.

Усё жыццё пішу, чытаю,
Спяваю, думаю на ёй.
І я ніякі не герой —
Я проста мову паважаю.

І як парою не жылося,
Жаданым быў яе палон.
У ёй спеў ветру, шэпт калосся
І ручайка вясёлы звон,

І веснія раскаты грому,
Празрысты пошчак салаўя.
Яна заўжды заве дадому,
Дзе б ні блукаў па свеце я.

2.

Чытаем, пішам —
кожны з нас
Сусвет спасцігнуць сіліцца.
Ці ж не гучыць прыемна: "аз",
"глаголь", "амега", "іжыца"?

Дабрэем ад харошых кніг,
З таго і радасць шырыцца.
Няхай жа славіцца той міг,
Як стала жыць кірыліца.

Царкоўны звон бярэ ў палон.
Цвітуць вяргіні ў кветніку.
Кірылу аддаём паклон —
Славянскаму асветніку.

Пяём Мяфодзію хвалу —
Паплечніку ягонаму,
У Грэцыю і ў свой Салунь
З маленства улюбёнаму.

Нас не ўявіць без кніг, газет,
І нам сказаць ёсць рацыя:
"Мы самая —
хай знае свет! —
Чытаючая нацыя".

Уявіць першапачатковы выгляд сольскага каталіцкага храма, што знаходзіцца ў Смаргонскім раёне, цяжка — бракуе адпаведных дакументальных крыніц. Але ў інвентары Сол, складзеным у ліпені 1544 года, захоўваецца першая звестка пра тое, што ён быў размешчаны ў цэнтры мястэчка пры рынку, на тым самым месцы, дзе раней знаходзілася царква. Другі касцёл на гэтым жа месцы быў узведзены каля 1612 года дзякуючы фундацыі полацкага ваяводы Яна Кішкі і ягонай жонкі Крысціны з Друцкіх-Сакалінскіх. У інфармацыі ад 1620 года згадваецца размешчаная побач парафіяльная школа і пададзены асобны запіс пра ўтрыманне двух кантараў, прызначаных для навучання спевам.

І адраджаўся зноў і зноў

У 1656 годзе сольскі касцёл згарэў падчас вайны Расіі з Рэччу Паспалітай, аднак пазней на яго месцы была ўзноўлена сціплая драўляная пабудова з адным алтаром, а ў званіцы захоўваліся на той момант ужо толькі два званы. Наступны касцёл на ранейшым месцы быў адбудаваны ў 1699 годзе. З архіўных крыніц вядома, што быў ён драўляным двухвежавым храмам на каменна-цагляным падмурку. Амаль праз стагоддзе, у 1794 годзе, падчас касцюшкаўскага паўстання храм, плябанія, усё касцельнае начынне і метрычныя кнігі згарэлі разам з мястэчкам Солы. У тым жа годзе быў атрыманы дазвол на ўзнаўленне сціплай драўлянай пабудовы, але і гэты помнік дойлідства загінуў у полымі напалеонаўскай вайны 1812 года.

У сярэдзіне XIX стагоддзя ў Солах узводзіцца новы парафіяльны касцёл, упершыню выяву якога можна пабачыць на малюнку мастака Н. Падбярэзкага і на здымку вядомага фотамастака Я. Балзункевіча. 4 кастрычніка 1853 года новы касцёл быў асвечаны біскупам Вацлавам Жылінскім у гонар Найсвяцейшай Дзевы Марыі Ружанцовай. Гэты помнік драўлянай архітэктуры меў дзве вежы, быў пакрыты гонтай, пафарбаванай у чырвоны колер. Пры ўваходзе знаходзіліся музычныя хоры на шасці калонах, а над імі — дзевяцігалосы арган. Напярэдадні 1862 года касцёл быў ашаляваны, абнесены мураванай агароджай, вымуравана была і званіца ў куце цвінтара.

Падзеі Першай сусветнай вайны не пашкадавалі святыню. У верасні 1915 года яна загінула ў пажары трагічных і кровапралітных баёў на смаргонскай зямлі. Набажэнствы ў час кайзераўскай акупацыі і ў першыя пасляваенныя гады былі перанесены на могілкавую капліцу ў вёсцы Івашкаўцы.

Памяць пра старадаўні касцёл, дзе не адно пакаленне вернікаў узносіла свае малітвы Усявышняму, захавалася ў мясцовых жыхароў. Таму ў 1926 годзе паводле праекта архітэктара Адама Дубановіча пачалося будаўніцтва сучаснага сольскага парафіяльнага касцёла ў гонар Маці Божай Ружанцовай. 24 чэрвеня 1927 года быў закладзены вуглавы камень. Падчас закладкі падмурку будаўнікі знайшлі скарб, які складаўся з найкаштоўнейшай бронзавай жырандолі з візантыйскім арлом і трыма фігурамі анёлаў наверсе, іншых культавых прадметаў. Вядомыя па інвентары з 1648 года рэчы былі схаваны перад вайной 1656 года. З дазволу курыі яны былі прададзены кракаўскаму антыквару, а атрыманыя грошы пайшлі на будаўніцтва храма.

Пабудова гэтага самабытнага і непаўторнага помніка мураванага дойлідства, мастацкае аздабленне і роспіс якога выканаў вядомы мастак Пётра Сергіевіч, была завершана ў 1934 годзе. Вось ужо больш як семдзесят гадоў прыцягвае храм пачуцці адданых вернікаў і ўвагу неабыякавых да архітэктурных шэдэўраў.

Уладзімір ПРЫХАЧ, краязнаўца

У вёсцы Міхневічы, што ў Смаргонскім раёне, побач з вясковымі могілкамі знаходзіцца прыгожы храм, пазначаны навукоўцамі як архітэктурны помнік рэтраспектыўнага рускага стылю — Свята-Пакроўская царква. Будынак прадольна-восевай кампазіцыі, з трох'яруснай шатровай званіцай, на якой, паводле сведчання мясцовых жыхароў, захаваліся старажытныя званы. Больш як 140 гадоў іхнія перазовы склікаюць праваслаўных людзей на набажэнства.

Нібы марскі карабель

Калісьці на тэрыторыі гэтага прыходу былі дзве царквы. Паводле сведчання царкоўнага гісторыка І. Спрогіса (1895 г.), у полі паміж сядзібай паноў Агінскіх і чыгуначнай станцыяй Залессе знаходзілася драўляная Свята-Георгіеўская царква, якую мясцовыя жыхары называлі "старой", у адрозненне ад "новай" — Свята-Пакроўскай, пабудаванай у 1866 годзе з бутавага каменю. "Старая" царква мела арыгінальную форму: увесь будынак з усімі яго арганічнымі дадаткамі — прытворам, алтаром і пярэдняй, пакрыты быў адным агульным, досыць высокім, амаль востраканечным гонтавым дахам, які, апускаючыся лёгкімі загібамі, надаваў храму прыгожы абрыс марскога карабля.

Галоўнай каштоўнасцю Свята-Георгіеўскай царквы была яе старажытная цудатворная ікона — абраз (копія) Прасвятой Багародзіцы Чанстахоўскай. Ушаноўваючы святыню, нават пасля асвячэння новай Свята-Пакроўскай царквы, "старую" не зачынялі: на друті дзень Вялікадня хадзілі прыхаджане вакол яе хрэсным ходам. Менавіта на Вялікдзень яе і спалілі ваяўнічыя атэісты.

Рабілі замах блюзняры і на міхневіцкі храм. Але мясцовыя жыхары адстаялі яго. Прыхаджанка Марыя Рак днявала і начавала ў царкве, пакуль пагроза не мінавала. Гэтая ж жанчына па ўласнай ініцыятыве ездзіла і шукала святароў для службы ў царкве. Яна сама трыццаць гадоў правяла ў манастыры і толькі пасля смерці бацькоў перабралася ў родную хату на хутар каля Залесся. Дарэчы, разам са сваёй маці, Вольгай Іванаўнай Гісіч, якая доўгі час была рэгентам царкоўнага хору (на працягу многіх гадоў спявала ў хоры). Пра гэта распавядала Вера Арсеньеўна Гісіч з вёскі Залессе. Дома ў Гісічаў збіраліся на рэпетыцыю залескія і міхневіцкія харысты. Іншым разам кватаравалі ў іх святары, якія служылі ў Свята-Пакроўскай царкве. Найбольш запомніўся Веры Арсеньеўне айцец Стэфан Рудзько. Добрым словам успамінаюць старажылы і святароў Васіля, Міхаіла, Сцяпана, Уладзіміра. Каля дзесяці гадоў служыў настаяцелем Свята-Пакроўскай царквы айцец Антоній Войтка, які ля старажытных сцен храма знайшоў свой апошні спачын.

Пра саму Свята-Пакроўскую царкву захаваліся архіўныя матэрыялы, якія, паводле святара Паўла Куцько, сведчаць пра наступнае: "Царква пабудавана была за кошт казны ў 1866 годзе і асвечана 8 ліпеня 1871 года. Прастол у ёй асвечаны быў у гонар Пакрова Прасвятой Багародзіцы. Маюцца два медныя званы — 192 і 48 кілаграмаў. Пры царкве існавалі на той час школы граматы".

Дарэчы, зямля побач з царквой захоўвае шмат таямніц, якія яшчэ давядзецца разгадваць нашчадкам. Цяперашні настаяцель, протаіерэй Анатоль Разановіч выказвае меркаванне, што, магчыма, побач з царквой знаходзіцца магіла рускага палкоўніка, ёсць там і пахаванні салдат рускай арміі, якія загінулі пасля газавых атак падчас Першай сусветнай вайны. Шматлікія пагоркі каля царкоўных сцен якраз і наводзяць на думку, што гэта не што іншае, як менавіта гістарычныя пахаванні мінулага стагоддзя.

Ала СТРАШЫНСКАЯ

Вытокі — на Беларусі, у Голацку

На прэмію Саюзнай дзяржавы

Вылучэнне славутых расійскіх мастакоў братоў Сяргея і Аляксея Ткачовых на прэмію Саюзнай дзяржавы нагадала і пра іх трывалую сувязь з Беларуссю.

Але для пачатку — крыху з біяграфіі знакамітых творцаў, радзіма якіх — вёска Чучуноўка Бранскай вобласці. Сяргей нарадзіўся 10 лістапада 1922 года, Аляксей — 11 верасня 1925... Сяргей Пятровіч у 1938—1941 гадах вучыўся ў Віцебскім мастацкім вучылішчы. У Вялікую Айчынную — на фронце. Цяжкапаранены. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II-й ступені, медалямі "За адвагу", "За баявыя заслугі". Аляксей Пятровіч у 1941—1942 гадах працаваў у эвакуацыі на "Уралмашы" ў Свярдлоўску. У 1942—1945 гадах вучыўся ў сярэдняй мастацкай школе пры Маскоўскім мастацкім інстытуце. У 1951 годзе Аляксей скончыў і мастацкі інстытут. За дыпломную работу "На канікулах" яму было прысвоена званне "мастак-жывапісец". Старэйшы брат скончыў той жа інстытут на год пазней. Дыплом Сяргея называўся "За мір!".

Пасля заканчэння інстытута браты патрапілі ў Мінск. У 1953 годзе беларускія калегі прынялі абодвух у Саюз мастакоў СССР.

...Ведаючы шмат пра повязь Ткачовых з Беларуссю з чужых вуснаў, знайшоў іх сённяшні маскоўскі адрас і звярнуўся з шэрагам пытанняў. Так нарадзілася завочнае знаёмства. Першай ужо бандэроллю Ткачовы даслалі кнігу-альбом "Мастакі пра сябе". Даслалі і асобнік для пухавіччан. Чаму менавіта для іх? Ды яшчэ напісалі: "Просім перадаць у Голацкую бібліятэку..." Але ж — пра ўсё па парадку. Калі Сяргей і Аляксей вучыліся ў маскоўскім інстытуце, то штогод улетку прыязджалі ў вёску Нізок Уздзенскага раёна, на Мінішчыну. Да бацькі і маці — Пятра Апанасавіча і Марыі Васільеўны, якія перасяліліся сюда пасля вайны. Справа ў тым, што ў Вялікую Айчынную іх дом на Браншчыне быў спалены. Вось старыя і пераехалі ў Беларусь, да сына Віктара. А той быў жанаты з Нінай Іванаўнай Трус, ураджэнкай вёскі Нізок (між іншым, далёкай сваячцы паэта Паўлюка Труса). Дарэчы, у свой час і Віктар вучыўся ў Віцебску, у мастацкім вучылішчы. Праз гады Сяргей Ткачоў будзе ўспамінаць: "Першым ... быў, канечне ж, Віктар. У 1937 годзе, не заканчваючы дзесяцігодку, ён паступіў у Віцебскае мастацкае вучылішча, у якое, акрамя яго, прыехалі вучыцца некалькі бежанскіх хлопцаў, выхаванцаў гуртка Дома піянераў: Валодзя Козін, Барыс Карабанкін, Мікалай Цітоў, Валодзя Пахоменкаў. Праз год, следам за Віктарам, у гэта вучылішча паступіў і я...

Чым растлумачыць памкненне групы маладых хлопцаў патрапіць менавіта ў гэтае вучылішча? Адказаць на гэта пытанне даволі складана... Бывае ж так, знойдзецца адзін смяльчак і пацягне за сабою астатніх. Адыгралі, канечне ж, сваю ролю і спрыяльныя чыгуначныя зносіны паміж Віцебскам і Бежыцай".

А ў 1950-я гады — новае адкрыццё Беларусі. У Нізку Сяргей і Аляксей трапілі ў знаёмы ім з дзяцінства сялянскі свет. Дапамагалі бацькам па гаспадарцы. А эцюды пісалі ў полі, на лузе, на малацьбе, ля вады.

Калі ў 1953 годзе братоў прынялі ў Саюз мастакоў, ім далі ў Мінску і невялікую кватэру. А яшчэ — майстэрню ў мансардзе. Хлопцы перавезлі бацькоў у Мінск. Ранейшая трывалая сувязь з Нізком абарвалася. А вёска цягнула да сябе, вабіла сваімі тэмамі, сваёй прасторай. І старэйшы брат параіў: вясной і летам — у Голацк, на Пухавіччыну.

"Натура, прырода былі нашымі выратавальнікамі і сябрамі, — расказваюць Ткачовы. — Пасля пераезду бацькоў у Мінск прыгледзелі сімпатычную вёску бліжэй да горада... Голацк палюбіўся нам. Кватаравалі мастакі ў Ганны Лявонцьеўны Прохарчык. Муж яе загінуў на фронце. Засталіся два сыны. Сталаваліся ўсе разам. Малака і бульбы хапала ўдосталь". Асабліва пасябравалі мастакі з Жорам — малодшым сынам гаспадыні. Гэта ён пазіраваў ім ля калодзежа, яго дзяўчаты аблівaюць вадою.

Ткачовы ўспамінаюць:

— У Голацку Жора стаў як бы сувязным звяном паміж намі і вясковай моладдзю. Школа, сцены якой хуценька запаўняліся нашымі эцюдамі, на тры летнія месяцы рабілася своеасаблівым мастацкім клубам.

Эцюды Голацкага перыяду (прыйшоўся яго пік на лета 1953 года) мастакі захоўваюць і цяпер. Гэта ці не самыя каштоўныя рэлікві ў іх творчым архіве: "Яны не толькі ўспаміны пра той слаўны час, але і па сённяшні дзень крыніца натхнення для нас", — гавораць Ткачовы.

Вялікі натурны эцюд "У полі" напісаны з групы падлеткаў на фоне поля, дзе ўжо скасілі збажыну, дзе ўсе фігуры можна пазнаць. Ён рэпрадуцыраваўся ў часопісах, манаграфіях. А карціны, якія былі напісаны крыху пазней ("Ля калодзежа" і "У полі. Самалёты ляцяць"), сталі на доўгі час візітоўкай братоў Ткачовых. Яны экспанаваліся на Усесаюзнай мастацкай выстаўцы ў Маскве — у Траццякоўскай галерэі. У 1955 годзе "голацкія карціны" былі паказаны і на Дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве.

Дзе ж цяпер работы, якія створаны на беларускім матэрыяле? У экспазіцыях музеяў Пензы і Астрахані. Варыянт карціны "Ля калодзежа" перададзены ў музей братоў Ткачовых, які ў 1995 годзе быў адчынены на іх радзіме — у Бранску.

Вышыні, якія адолелі браты Ткачовы і разам, і паасобку, — Вёска, яе вялікасць Вёска! Вяселлі і хаўтуры, нараджэнне дзіцяці і вясковая дзятва, старыя і маладыя...

Сёння карціны Ткачовых знаходзяцца болей, як ў ста (!) музеях свету. А яшчэ — у прыватных калекцыях у Англіі, Бельгіі, Германіі, Галандыі, Італіі, Канадзе, Кітаі, ЗША, Тайвані, Францыі, Паўднёвай Карэі, Японіі... Між іншым, у 1998 годзе ў Кітаі (на рускай і кітайскай мовах) выдадзены велізарны альбом "Рускія мастакі браты Ткачовы". Работы Ткачовых прадаваліся на аўкцыёне Сотбіс.

...І, канечне ж, памятаюць вялікіх рускіх мастакоў, якія спрычыніліся да лёсу народа Беларусі, і ў Голацку, на Пухавіччыне.

Кастусь ЛАДУЦЬКА

На здымку: браты Ткачовы.

Знаныя майстры ў галіне скульптуры — народны мастак Беларусі лаўрэат Дзяржаўнай прэміі краіны Леў Гумілеўскі ды яго сын Сяргей Гумілеўскі ў творчым тандэме з архітэктарам Яўгенам Мядзько завяршылі працу над помнікам Францішку Багушэвічу ў разгар падрыхтоўкі да Дня беларускага пісьменства. Бронзавай фігуры вышынёю 3 метры 60 сантыметраў наканавана не толькі аздобіць гарадскі ландшафт, але і ўнесці важны акцэнт у духоўнае жыццё Смаргоні.

Пачаткам было слова

Пры канцы жніўня, калі бацька і сын Гумілеўскія штораніцы выязджалі з цэнтра сталіцы ў пасёлак Сосны і шчыравалі там на сваёй творчай кухні — у ліцейнай майстэрні, часу на размовы ў іх амаль не заставалася. І ўсё ж Леў Мікалаевіч знайшоў колькі хвілін, каб распавесці чытачам "ЛіМа" пра новую работу.

— Наконт узнікнення самой задумы... Якая ж задума помніка паэту можа быць без ведання і асэнсавання яго жыцця, яго творчасці? Менавіта з жыцця і творчасці Францішка Багушэвіча і высноўвалася задума, у аснове якой — тыя словы, што напісаў наш пісьменнік, паэт, у славутай "Прадмове". Вы ж ведаеце яго "Прадмову"?.. Дык вось, "не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі..." — такія словы, што беларуса сапраўднага не могуць пакінуць без хвалявання. Гэта вялікія словы! І для жыцця нашага, і для Радзімы нашай... Таму гэтыя словы і леглі ў аснову нашага помніка: Багушэвіч задуменны, думае, што ж будзе з нас далей, каб мы не ўмёрлі... Працуем сумесна: я, сын і архітэктар Яўген Уладзіміравіч Мядзько, з якім раімся па кожнай дэталі справы.

А калі ўсё пачыналася? О, гэта было, ведаеце, у 1990-я гады, калі былі абвешчаныя конкурсы: мы бралі ўдзел і ў першым конкурсе, і ў другім, выйгралі. Мясцовыя ўлады і грамадскасць Смаргоні ўхвалілі задуму, ды потым "перакройка" планаў пачалася, і ўсе справы, звязаныя з помнікам Багушэвічу, заглухлі... А летась выпадкам сын пачуў па радыё, што наступны Дзень беларускага пісьменства будзе праходзіць там, і я патэлефанаваў у Смаргонь. Старшыня райвыканкама быў узрадаваны, што ў нас усе напрацоўкі захаваліся, планшэты, эскізы ляжалі на паліцах: "Ой, як цудоўна! Мы ж думалі, што гэта ўсё ўжо загінула...". Але ж такое загінуць не можа: рукапісы не гараць! Такую тэму, такую ідэю, такога чалавека мы не можам не ўвасобіць! Гэта ж наша поле беларускае, на якім мы аром.

Гаворачы нашай прафесійнаю мовай, мы "на ліцейцы" прапрацоўваем воск фігуры, трэба бронзу заліваць, зямлёй засыпаць... Некаторыя фрагменты ўжо адлітыя. З кавалкаў потым, пры дапамозе зваркі, робіцца мантаж фігуры. Усё вакол гудзе, грукае, кампрэсары працуюць. Праца напружаная, гарачая. Але прыемна думаць, што хоць да сёлетняй святочнай нагоды мы выходзім з нейкім вынікам. Узнікла, праўда, дыскусія наконт месца ўстаноўкі помніка... Але мне ўрэшце важна не месца, на якім ён будзе стаяць, не тэрмін, калі ён фармальна будзе адкрыты. Для мяне важна было ўвасобіць постаць Багушэвіча, важна, што помнік ужо ёсць. Гэта — бронза, яна не спрахне, і гэта — не іголка, якая можа згубіцца ў траве. Гэта — манумент, і ён будзе жыць!

▼

Пра захапленне Льва і Сяргея Гумілеўскіх беларускім словам і глыбінямі роднай гісторыі, пра тое, як уплываюць постаці айчыннай літаратуры і культуры на іх мастацтва, можна распавядаць асобна. Прыгадайма, напрыклад, што дзякуючы іх натхнёнай працы паўстаў у Гомелі манумент Кірылу Тураўскаму; у Ялце на могілках, на месцы апошняга прытулку Максіма Багдановіча, з'явілася адметная скульптурная выява паэта. А за стварэнне помніка Янку Купалу (2004 год), пра гісторыю працы над якім "ЛіМ" у свой час пісаў і які ўстаноўлены ў сталіцы Расійскай Федэрацыі — Маскве, Леў Гумілеўскі, Сяргей Гумілеўскі ды народны архітэктар Расіі Юры Грыгор'еў вылучаныя на атрыманне прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва за 2009 — 2010 гады.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымку: макет новага помніка Францішку Багушэвічу.

Фота Анатоля Дрыбаса

Чалавек неабыякавы, адкрываючы для сябе архітэктурную спадчыну роднага краю, дакранаючыся праз яе да мінуўшчыны, пачынае цікавіцца далёкай гісторыяй. І разумець і цаніць каштоўнасць страчанага. Ён імкнецца зберагчы ацалелыя "памяткі дзён" і па мажлівасці ўзнаўляць, вяртаць з нябыту зруйнаваную памяць. Бо якой бы ні паўставала перад намі даўніна — рамантычнай, апаэтызаванай, сентыментальнай, жорсткай, поўнай трагізму, — яна ўзбагачае наш духоўны, эстэтычны, інтэлектуальны досвед і мацуе нацыянальную годнасць...

Пра што яны распавялі б?

Лёс балышыні гістарычных набыткаў айчыннага дойлідства падзяліла і архітэктура Смаргоншчыны. Княжацкія міжусобіцы і знішчальныя пажары; бітвы з іншаземцамі ў XX стагоддзі; варварскі глум са святыняў ды помнікаў мастацкай культуры ў савецкі мірны час... Многія колішнія адметнасці свайго архітэктурна-ландшафтнага аблічча Смаргоншчына страціла незваротна.

Сярод малюнкаў Напалеона Орды і зробленых з іх літаграфій, альбомы якіх ужо неаднойчы выдаваліся ў нашай краіне (напрыклад, "Беларусь у малюнках Напалеона Орды"; "Напалеон Орда. З фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі" — абодва выйшлі ў выдавецтве "Беларусь" у 2004 і 2006 гадах адпаведна), захавалася выява самай знакавай "памяткі дзён" смаргонскай, дый усёй нашай, зямлі. Мастак зрабіў і подпіс пад гэтым малюнкам (у арыгінале — на польскай і французскай мовах): "Крэва (Віленская губерня). Руіны знакамітага замка. Тут, у сваім спадчынным уладанні, жыў вялікі князь Альгерд перад уступленнем на трон. Вежа вядомая трагічнай смерцю ў 1382 годзе вялікага князя літоўскага Кейстута". Час бяжыць, і тыя маляўнічыя руіны спакваля ператвараюцца ў горку камянёў... Занатаваў наш таленавіты зямляк-вандроўнік і палац Міхала Клеафаса Агінскага ў Залессі. Праўда, гэты малюнак, як і адметны ракурс краявіду залескага маёнтка, адлюстраваны Леанардам Ходзькам, не знойдзеш у нашых мастацкіх альбомах, але можна ўбачыць у іншай літаратуры або... у руках экскурсавода падчас вандроўкі па Залессі.

Гартаючы вядомы сучасны альбом "Хрысціянскія храмы Беларусі на фотаздымках Яна Балзункевіча. Пачатак XX стагоддзя" (укладальнікі Анатоль Кулагін і Уладзімір Герасімовіч), углядаючыся ў рэпрадукцыі простых і такіх кранальных старых фота, спрабуеш абудзіць уласную фантазію. Бо хочацца ўявіць, пра што распавялі б гэтыя правінцыйныя культавыя будынкі, калі б віхура гісторыі не змяніла іх, амаль да непазнавальнасці, а то й наогул не ператварыла ў друз...

Касцёл Маці Божай Ружанцовай, які быў пабудаваны на Смаргоншчыне ў вёсцы Солы на пачатку XX стагоддзя, не меў выразна акрэсленай стылёвай трактоўкі. У 1926 — 1934 гадах на яго месцы ўзвялі новы мураваны храм. У касцёла святога Яна Хрысціцеля, што ўзводзіўся на мяжы XVI—XVII стагоддзяў у славутым Крэве, больш складаны лёс. Яго перараблялі пад царкву (1868), затым аднаўлялі (1906). Помнік архітэктуры барока, ён у пазамінулым стагоддзі "атрымаў прышчэпку" рэтраспектыўна-рускага стылю. Свята-Міхайлаўская царква ў Смаргоні ад свайго нараджэння (у сярэдзіне XVII стагоддзя) была касцёлам св. Міхаіла Арханёла. У 1858 годзе адбылося аднаўленне касцёла, а ў 1866-м ён стаў царквой і ўвайшоў у гісторыю як помнік рэнесанснай архітэктуры з рысамі абарончага дойлідства і рэтраспектыўна-рускага стылю XIX стагоддзя. А кальвінскі збор (1553 г. у пачатку 1990-х пераабсталяваны пад касцёл), што паўстаў амаль каля самых вытокаў біяграфіі старажытнай Смаргоні, захаваў, бадай, толькі сны пра сваё пратэстанцкае мінулае...

Многія гістарычныя пабудовы Смаргоншчыны, аб'ектыўныя і шчырыя сведкі жыцця тутэйшага люду, сышлі ў нябыт — як знішчаныя дакументы. Усцешвае хіба толькі тое, што энцыклапедычная ды мемуарная літаратура, навуковыя даследаванні, пошукі краязнаўцаў і гісторыкаў, а яшчэ — старадаўнія малюнкі ды фатаграфіі, зробленыя на пачатку мінулага стагоддзя, аднаўляюць нашу памяць пра былое і дапамагаюць яе захаваць.

Лана ІВАНОВА

На здымках: смаргонская Свята-Міхайлаўская царква; касцёл св. Яна Хрысціцеля (Крэва); былы кальвінскі збор у Смаргоні; "Палац Агінскіх у Залессі" — малюнак Н. Орды; "Залессе. Краявід сядзібы. 1822" — малюнак Л. Ходзькі; літаграфія з малюнка Н. Орды "Крэва"; касцёл Маці Божай Ружанцовай у Солах.



Смарагдавы рай

Пагодлівая жнівеньская субота. Ранішні цягнік. Ад сталіцы да Залесся ехаць крыху больш як паўтары гадзіны. Часу хапае, каб настроіцца на рамантычны лад, успомніць сваё першае спатканне з радзімай славутага Паланеза ля мінор і ўявіць, як жа цяпер там, у "сядзібе муз" яго стваральніка, князя Агінскага... Але спачатку — факты з гісторыі.

Вядома, што Міхал Клеафас прыехаў сюды, у маёнтак свайго дзядзькі Францішка Ксаверыя Агінскага, як яго законны спадкаемца, увесну 1802 года. Дзядзька перасяліўся ў Маладзечна, пакінуўшы новаму ўладальніку Залесся гаспадарку, якая вымагала аднаўлення. Будаўніцтва новай сядзібы і ўпарадкаванне прылеглых земляў вялося паводле асабістых творчых прапаноў князя, які абсталёўваў тут сталае жытло для сваёй новай сям'і.

За 20 гадоў Залессе, размешчанае напаўдарозе між Мінскам і Вільняй, блізу шляхоў з Пецярбурга ў Варшаву, набыло гучную славу "Паўночных Афін". Тут М. Кл. Агінскі плённа займаўся "музыкатворчасцю": іграў партыю першай скрыпкі ў струнных квартэтах, напісаў шмат фартэпіянных п'ес, у тым ліку Паланез ля мінор. (Назву "Развітанне з Радзімай", на думку даследчыкаў, пазней далі ўдзельнікі паўстання 1863 г., сасланыя ў Сібір). Але шлюб яго пацярпеў фіяска, дзеці пасталелі, і ў 1822 г. шаноўны дыпламат, сенатар, палітык, музыкант, эстэт, патлумачыўшы свой ад'езд неабходнасцю змяніць клімат з прычыны абвастрэння падагры, пакінуў Залессе і пасяліўся ў Фларэнцыі. "Паўночныя Афіны" перайшлі ў спадчыну да сына — Ірэнеуша Агінскага. Ён жыў тут з маці, на імяніны якой аднойчы сабралі гасцей, наладзілі феерверк у парку і "Дажынкі" ў Ратондзе "Міхалава лесу"... Ды ўрэшце сядзіба прыйшла ў заняпад.

Мяняліся гаспадары. У 1930-я гады тут зрабілі прыватны пансіянат, куды ездзілі адпачываць з Варшавы і Вільні. З 1939 па лета 1941-га ў палацы — Дом адпачынку для мінчан. Ён працаваў і пасля вайны, а ў 1961-м стаў Домам састарэлых. У 1977 г. маёнтак з прылеглай тэрыторыяй перадалі на баланс Смаргонскаму сілікатнаму (цагельнаму) заводу. Апошнім жа часам музей-сядзіба "Залессе" з'ўляецца філіялам Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі. Супрацоўнікі сталічнага музея на чале з дырэктарам Зінаідай Кучар плануюць стварэнне ў Залессі пастаяннай экспазіцыі з выкарыстаннем архіва М. Кл. Агінскага (атрыманы з Расіі ў выглядзе копій — мікрафільмаў і кампакт-дыскаў, дзякуючы ініцыятыве Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА і энтузіязму яе старшыні Уладзіміра Шчаснага). Але найперш трэба аднавіць сядзібу. Экспертыза праекта яе рэстаўрацыі праведзена. Застаецца "знайсці" грошы...

"Усе людзі, якія мелі вагу ў грамадстве, слынныя грамадзяне Кароны і Літвы, якія рупіліся пра дабрабыт сваёй краіны, прыязджалі ў Залессе, каб абмяняцца меркаваннямі, і збіраліся ў князя, які быў для іх гасцінным гаспадаром часам на цэлыя тыдні... Князь раўнамерна размеркаваў свой час. Раніцай ладзіліся сур'ёзныя дыскусіі з удзелам "свяцілаў", што гасцявалі ў доме, уладкоўваліся справы, разбіралася карэспандэнцыя і дыктаваліся дзённікі. А першай дня ўсе ішлі на сняданак, пасля якога ля дома збіралася вялікая колькасць экіпажаў і проста запрэжаных коней, і ўся кампанія, дамы і панове, выпраўляліся, хто ў экіпажы, хто ў сядле, у дамоўленае месца. Гэтая пацеха працягвалася каля дзвюх гадзін, затым, вярнуўшыся ў палац, усе, як правіла, слухалі музыку: квартэт выконваў новыя творы, якія пастаянна дастаўляліся ў Залессе з-за мяжы..." З мемуараў графа Канстанціна Тышкевіча.

Залатая восень 1986-га, час маёй першай вандроўкі ў Залессе. Праз дваццаць з лішкам гадоў прыгадваецца бляшаная ахоўная шыльда парку, прымацаваная да аднаго з дрэваў; сірочы выгляд занядбаных сядзібных пабудоў; камень з надпісам "Cieniom Kosciuszki" — мемарыял князя ў гонар загінулых паўстанцаў (слова "цені" ў беларусаў азначала "душы"); рахманы конь на ўскрайку яблыневага саду; маляўнічае азярко; бязлюддзе і цішыня... Цяпер я настройваю сябе на сустрэчу з іншым Залессем: уяўляю чародкі турыстаў-іншаземцаў, нашых экскурсантаў — з набытымі тут буклетамі, пазнаваўчымі кнігамі, мясцовымі сувенірамі ды кампакт-дыскамі ў руках; з расчыненых вокнаў палаца льецца музыка: ці жывыя гукі фартэпіяна, ці гранне квартэта; ахвочыя да прагулак па наваколлі могуць арандаваць брычку; для аўто ўезд забаронены... Здавалася б, нічога фантастычнага, але наколькі далёкім аказваецца маё ўяўленне ад залескай рэальнасці!

У дыяментах світальнай расы — стракаты кветкавы ўзор на смарагдавым кіліме высокай травы; смарагдавыя шаты густой лістоты песціць ранішняе сонца. Бязлюддзе. Цішыня... У цёмна-зялёных сховах — па-крынічнаму празрыстая рачулка, праз якую да крутога берага вядзе адмысловая кладка з ладных камянёў. А ля падножжа старых дрэў — вялікі камень з надпісам, якім Міхал Клеафас ушанаваў памяць свайго першага настаўніка Жана Ралея і які мясцовыя энтузіясты знайшлі пазней за касцюшкаўскі — у 1995-м. Насупраць вадзянога млына — казачны ставок, акаймаваны ніцымі дрэвамі, з рамантычным востравам; плавае пара лебедзяў, якіх клічуць Ля і Мінор. Арнітолагі сцвярджаюць, што пры захаванні экалагічных умоў у мясцінах традыцыйнага гнездавання птушак, іх новыя генерацыі ляцяць з выраю да "радзінных сядзіб" сваіх крылатых продкаў. Магчыма, Ля і Мінор працягваюць род лебедзяў, што пасяліліся тут пры Агінскіх?

Суправаджае нас на паркавых сцежках старшы навуковы супрацоўнік музея-сядзібы Сяргей Верамейчык. Стараецца не паўтараць інфармацыю, якую можна знайсці ў яго кнізе "Міхал Клеафас Агінскі. 1765 — 1833. Продкі, жыццё ў Залессі, нашчадкі", выдадзенай у 2003 г. Кампактная і надзвычай змястоўная, яна не губляецца побач з кнігамі нашчадкаў князя — Анджэя Залускага "Час і музыка Міхала Клеафаса Агінскага", Івы Залускага "Ген Агінскага" і даследаваннем Святлены Немагай "Жыццё і творчасць М. К. Агінскага ў каардынатах яго часу і культурнага асяроддзя".

20 гадоў таму Сяргей Верамейчык, мінчук, выпускнік Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, удзельнік многіх рэстаўрацыйных праектаў, пераехаў са сталіцы ў вёску Залессе, дзе жылі яго сябры-мастакі. Вёў у школе ўрокі малявання, кіраваў дзіцячай майстэрняй малявання "Апалонік", тэатральна-музычнай студыяй "Альтанка". Займаючыся музейнай педагогікай, разам са сваімі выхаванцамі ладзіў штогадовыя святы на дзень нараджэння Агінскага: 16 святаў адбылося! Для юных студыйцаў арганізаваў паездкі па мясцінах славутага земляка: у польскі Гузаў, дзе нарадзіўся Міхал Клеафас, у Літву, у Фларэнцыю, дзе завяршыўся яго зямны шлях... Музыка-самавук, С. Верамейчык стварыў для альтанкаўцаў займальную і пазнаваўчую оперу "Сон у Паўночных Афінах, ці Сон Антонікі". Навучыў дзяцей граць на блок-флейтах.

Сёння цяжка знайсці падтрымку ў фундатараў, а энтузіязму на ўсё не хапае, і святы тут ужо не ладзяцца. Адмысловая дэкарацыя батлейкі-альтанкі, дасціпныя капелюшы ў выглядзе паркавых пабудоў, ад імя якіх вялі расповед персанажы оперы, ператварыліся ў экспанаты хатняга музея. І ўсё ж мастак-настаўнік ужо заўважае плён патрыятычна-эстэтычнага выхавання: яго былыя вучні самастойна праводзяць для сваіх гасцей экскурсіі па сядзібе. Сяргей Іванавіч не страчвае надзею зрабіць у адрэстаўраваным палацы вясковую школу мастацтваў імя Агінскага. І марыць, што калі-небудзь і ў беларускіх школах, як ва ўсім свеце, урокі гісторыі будуць пачынацца з вывучэння канкрэтных адметнасцяў малой радзімы, а не экзатычных чужых мумій.

Па дарозе на Мінск успаміналася "новае веданне" пра Залессе. Дзе быў стары французскі "версальскі" парк; якія таемныя куточкі размяшчаліся ў парку англійскім; дзе знаходзіўся звярынец і куды выстаўлялі на лета кадушкі з апельсінавымі дрэвамі, вызваляючы памяшканне аранжарэі пад сталовую. У чым карысць ад цяперашняй кансервацыі палаца; у чым архітэктурны сакрэт ужо адноўленай князевай капліцы, дзе штотыдзень правіць набажэнства ксёндз са Смаргоні. У чым важнасць аховы г. зв. відавых кропак. Чаму млын, калі знойдзе гаспадара-спонсара, можа ў хуткім часе зрабіцца папулярнай і прыбытковай кавярняй...

Сама вёска Залессе нагадвае сваім архітэктурным абліччам шараговы дачны пасёлак. А сядзіба мае сусветную каштоўнасць як месца, дзе быў створаны славуты паланез, дзе 20 гадоў пражыў яго знакаміты аўтар. Была б такая каштоўнасць на тэрыторыі нашых суседзяў — палякаў, літоўцаў, расіян, — хіба яны закансервавалі б яе на няпэўны тэрмін? Гэты куток райскай прыроды побач з Віліяй быў бы гонарам краіны, месцам паломніцтва турыстаў.

Дом-музей П. Чайкоўскага ператварыў правінцыйны падмаскоўны Клін у вядомы пункт на турыстычнай карце свету. Ужо не кажу пра Жалязову Волю пад Варшавай з летнімі канцэртамі ў сціплым родным дамку Фрыдэрыка Шапэна, куды імкнуцца трапіць і музыканты, і меламаны. Трэба не так ужо і шмат, каб сусветная слава павярнулася тварам і да нашага Залесся.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымках: ставок з выспаю; герб роду Агінскіх; чыгуначны вакзал; Сяргей Верамейчык у капліцы — з музычным экспромтам для гасцей; капліца ў сядзібе; палац князя; камень ва ўшанаванне Жана Ралея; валун-"ахоўнік".

Фота Віктара Кавалёва

Подых крэўскай даўніны

Школа на ўзгорку

Сустрэча наша некалькі разоў адкладвалася. Хаця жыве Аляксандр Камінскі непадалёку, кіламетраў дваццаць ад Смаргоні, у знакамітым Крэве.

У Крэўскай школе ён працуе настаўнікам французскай мовы — скончыў прэстыжны "ін'яз". Але яго галоўны "кабінет" — створаны ім жа самім школьны краязнаўчы музей, вакол якога і аб'яднаў такіх жа апантаных даследчыкаў даўніны. Сярод цікавых экспанатаў — нават паржавелыя ключы ад былога Крэўскага замка. Музей — гэта багатая гісторыя роднага Крэва, пачынаючы ад шматлікіх легендаў і да сённяшняга дня. Ёсць тут і гісторыя роднай школы. Сёння яна стаіць на высокім узгорку. Вышэй нават за рэшткі галоўнай вежы замка, якая бачна непадалёку.

Тады, калі школа адзначала сваё 35-годдзе, ніхто з прысутных гасцей не ведаў, якую неспадзяванку падрыхтавалі для іх краязнаўцы. Новая экспазіцыя школьнага музея, менавіта па гісторыі школы, прымусіла святкаваць значна старэйшы юбілей — 365-годдзе! Менавіта ў тым далёкім 1636 годзе паўстаў у Крэве новы будынак касцёла. І сярод касцельнай маёмасці, запісанай у інвертарную кнігу, значыцца будынак школы, які размяшчаўся побач з плябаніяй. Праз паўтара стагоддзя ў гэтай школе спасцігалі навуку 20 вучняў — па шэсць дзетак са шляхецкіх сем'яў і сялянскіх, восем — з мяшчанскіх.

У пачатку XIX стагоддзя ў школе навучалася штогод толькі 4 — 7 вучняў, а ў канцы стагоддзя, ужо пры царкве, была адчынена аднакласная царкоўнапрыходская школа. Але на паўстагоддзя раней у Крэве было заснавана народнае вучылішча, якое дзейнічала да Першай сусветнай вайны.

Потым на змену русіфікацыі прыйшла паланізацыя. У новай школе навучанне працягвалася шэсць гадоў. Вучні, якія поўнасцю праходзілі курс навукі, атрымоўвалі грунтоўныя веды, многія працягвалі вучобу ў Ашмянскай гімназіі, а пасля — у Віленскім універсітэце.

Калі ў Крэва прыйшлі немцы, а пазней — літоўскія паліцаі, да адукацыі нікому не было справы. І толькі ў самы разгар акупацыі крэўскі праваслаўны святар Міхаіл Леванчук дамогся дазволу адчыніць тут беларускую школу, у якой працавалі настаўнікамі ягоная дачка Ларыса і пляменніца Валянціна. Але ў сакавіку 1944 года настаўніцы і сам святар былі жорстка забітыя "акаўцамі".

Гэтая школа стала сёння сапраўдным цэнтрам патрыятычнага выхавання вучняў, якіх тут каля 170, на прыкладзе гісторыі роднага краю. Самі вучні на чале са сваім настаўнікам-краязнаўцам па кроплях збіраюць гэтую гісторыю і старанна занатоўваюць яе для нашчадкаў.

Крывавае Крэва

Ад самога Крэўскага замка мала што і засталося. І аднавіць яго, як тое прапанавалі навукоўцы яшчэ гадоў пятнаццаць таму, упэўнены А. Камінскі, не ўдасца. Не ўдасца па той простай прычыне, мяркуе Аляксандр, што немагчыма аднавіць Калізей ці "прышчапіць" новыя рукі Венеры Мілоскай.

Аднаўленне вымагае само мястэчка Крэва. Хаця б да часін XIX стагоддзя, калі сяляне з навакольных вёсак звярталіся да местачкоўцаў на "вы" і здымалі перад імі шапкі. Тут ёсць спадзяванні на аграгарадок, які крыху "акультурыў" Крэва. Што ж датычыць унутранага "начыння", подыху гісторыі, то школьнікі з гуртка Камінскага могуць правесці па Крэве такую экскурсію, якая і не снілася прафесіяналам. Экскурсію па легендах і жывой гісторыі.

Да нашага часу не спыняюцца спрэчкі пра тое, дзе насамрэч знаходзілася напаўлегендарная нальшанская зямля. Большасць вядомых даследчыкаў тлумачыць, што Нальшаны размяшчаліся ў басейне Заходняй Бярэзіны, якраз на тым месцы, дзе пазней утварылася Крэўскае княства. Да таго ж і адна з нямецкіх хронік XIII стагоддзя менавіта Крэва называе сталіцай Нальшанаў. Ну а тапонімы Крэва, Крыўск, Крыўлянка, Закрэўе — гэта вытворныя і ад "крывічаў", і ад "крыві".

У сярэдзіне XIII стагоддзя на чале Літвы стаў Міндоўг. Ён — заснавальнік на прасторах Еўропы новай дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага. Тэрыторыя яго павінна была ахапіць і Нальшаны, дзе князем быў саюзнік Міндоўга Даўмонт. Жонкі гэтых князёў былі роднымі сёстрамі. Але падпарадкавацца Міндоўгу Даўмонт не збіраўся. У 1258 годзе Нальшаны зведалі набег войскаў мангола-татарскага хана Бурундая і валынскага князя Васількі Раманавіча. Не паспеў Даўмонт ачуняць ад гэтага набегу, як атрымаў другі ўдар — пасля смерці сваёй жонкі Міндоўг нахабна выкраў яе сястру ў нальшанскага князя. Праз нейкі час, змовіўшыся з іншымі князямі, Даўмонт забівае Міндоўга разам з двума ягонымі сынамі. Але старэйшы брат Міндоўга Войшалк ідзе на землі забойцы і далучае Даўмонтаву вотчыну да Вялікага княства. Сам нальшанскі князь шукае схавішча ў славянскім Пскове, дзе яго, пасля прыняцця ім праваслаўя, абіраюць сваім князем. За свае паслугі перад Богам і славянскім народам Даўмонт-Цімафей пасля смерці быў кананізаваны. Жыхары Крэва могуць ганарыцца, — піша А. Камінскі ў сваёй кнізе "Пад хвалямі Крэўскага мора", — адзін з праваслаўных святых мае крэўскае паходжанне. Цікава і тое, зазначае краязнаўца, што другой жонкай Даўмонта-Цімафея была ўнучка яшчэ аднаго святога — князя Аляксандра Неўскага, у гонар якога амаль праз шэсць стагоддзяў была асвечана царква ў Крэве.



Крэва

Вітанне, Крэва!
Праз стагоддзяў звёны
Амшэлыя, сівыя валуны,
Баронячы князёў літоўскіх троны,
Глядзяць лабаста з замкавай сцяны.

Якія рукі іх сюды скацілі,
Каб ацішэў напорлівы тэўтон?
І вось цяпер, змарнелыя ў бяссіллі,
Мячоў і дзідаў чуюць даўні звон.

Вятрамі далеч сцебане па сценах,
Учыніць з даўняй прошласці налёт.
І ластавак на ўзнесеных антэнах
Раскатным гулам спудзіць самалёт.

І страпянецца Крэва ў іншым часе,
Свой белы дзень душой прывеціць зноў.
Пад ім жывой былінай засталася
Сівая памяць вечных валуноў.

Мікола МЯТЛІЦКІ

А Крэва тым часам абазначылася імёнамі Альгерда і Ягайлы, якім княства дасталося ў спадчыну. Аднак тут, у вежы Крэўскага замка, слугі Ягайлы задушылі ягонага дзядзьку Кейстута. Ледзь уратаваўся ад такой жа кары стрыечны брат Ягайлы Вітаўт. Менавіта тут у 1385 годзе была падпісана Крэўская унія. А сам Ягайла быў абраны каралём Польшчы і ажаніўся з дачкой караля Людовіка Ядвігай. Праз паўстагоддзя Крэўскі замак быў штурмам узяты войскам Свідрыгайлы — яшчэ аднаго прэтэндэнта на трон Вялікага княства Літоўскага.

Ёсць звесткі, што ў 1507 годзе Крэва наведаў кароль Жыгімонт Стары, а ў сярэдзіне таго ж стагоддзя тут пасяліўся перабежчык ад цара Івана Грознага князь Андрэй Курбскі. Ужо ў XX стагоддзі, у перамежку паміж войнамі, тут пабываў тагачасны прэзідэнт Польшчы Ігнацій Масціцкі. Зрэшты, гэтыя дзве вайны пакінулі на крэўскай зямлі самы вялікі крывавы след. Ад Першай сусветнай каля рэшткаў замка застаўся нямецкі дот, а ў недалёкім лесе — шматлікія магілы салдат, якія руплівa адшукваюць цяпер краязнаўцы. У Другую сусветную найбольш пацярпелі ад гармат сцены Крэўскага замка.

У 1912 годзе ў польскім часопісе "Зямля" быў надрукаваны краязнаўчы артыкул "Крэўскі замак". І там згадваецца мясцовая легенда, быццам бы за ўчыненыя ў замку злачынствы Бог асудзіў гэтыя збудаванні на пагібель. І звязаў з ім лёс усёй Польшчы. Кожны год з замкавых муроў павінна адрывацца па камяні і па некалькі цэглаў. І калі замак будзе поўнасцю ў руінах — толькі тады ўваскрэсне Польшча. У час надрукавання легенды Польшчы як самастойнай дзяржавы не існавала на карце Еўропы. Яна адрадзілася пасля Першай сусветнай вайны, а сапраўдную самастойнасць і незалежнасць набыла яшчэ пазней. Менавіта тады, калі войны паскорылі разбурэнне замка, калі ён апынуўся ў руінах. Вось так пераплятаюцца ў легендах і жыцці лёс замка з лёсам людзей і нават дзяржаў.

Спляценне лёсаў

Пакаленнем апаленых лёсаў назваў А. Камінскі сваіх суседзяў-крэўчан. І сапраўды, вось, да прыкладу, гісторыя аднаго фотаздымка — кранальная да неверагоднасці.

Зроблены ён быў у пачатку трыццатых гадоў мінулага стагоддзя. На ім — вучаніцы аднаго з класаў Крэўскай школы разам са сваёй настаўніцай. Звычайныя дзяўчынкі — і адначасова цэлая кніга лёсаў. Хто мог бы падумаць, што лёсы гэтых дзяўчынак будуць такімі рознымі — у адным шэрагу аднакласніц стаяць будучая партызанка, якую расстралялі фашысты, і будучая жонка паліцая. Разумная і баявая Зіна скончыла Ашмянскую гімназію, а ў 1942 годзе будзе вывезена ў Германію і пасля вайны знойдзе прытулак недзе ў Англіі. Прыгажуня Стаська выйдзе замуж за рускага, які прыедзе сюды раскулачваць яе бацьку і ствараць калгасы. У іх народзіцца сын, якога ўсе будуць ведаць як паэта Уладзіміра Някляева. Сціплая Шура звяжа свой лёс з настаўнікам Пятром Грынкевічам, які аддаў усё сваё жыццё вывучэнню гісторыі роднага краю. Ды большасць дзяўчынак ператрывае ваеннае ліхалецце, абзавядзецца сем'ямі, будзе жыць і працаваць на роднай зямлі ці за яе межамі.

Няпростым аказаўся і лёс настаўніцы Ірэны Аляхновіч. Яе муж, настаўнік Бандаровіч, паходзіў з Валыншчыны. Адтуль, дзе, як ён казаў, быццам праклён: "Каб ты цягаў камяні на Крэўскі замак!". Яму цягаць камяні ў Крэве не давялося, але той праклён збыўся іншым чынам. Бандаровіч стаў ахвярай Катыні, а Ірэну чакала высылка ў далёкую Сібір...

Як птушка Фенікс

Крэўскія сем'і нярэдка былі змяшаныя: бацька быў каталіком, а маці — праваслаўнай. Але калі ў такіх сем'ях нараджаліся дзеці, праблем з хрышчэннем не было. Альбо прыходзілі да згоды і хрысцілі паводле якога-небудзь аднаго абраду, альбо сыноў далучалі да бацькавай веры, да дачок — да матчынай.

Дарэчы, такая ж гісторыя і ў сям'і Камінскіх. Добра ведаючы пра ўсіх князёў ды каралёў, Аляксандр не пакінуў у баку і свой радавод. Даведаўся, напрыклад, што маці ягоная паходзіла з вядомага роду Данілавічаў, ну а Камінскія — гэта асобная гаворка. Дастаткова сказаць, што яшчэ напрыканцы XIX стагоддзя старажытны скарб манет Камінскіх быў адпраўлены ажно ў Пецярбург. У гэтым радаводзе таксама шмат цікавага, пра што краязнаўца не вельмі імкнецца апавядаць. Сказаў толькі, што бацька ягоны нарадзіўся ў Расіі ў 1915-м, падчас эвакуацыі ягонай сям'і ў Першую сусветную, а маці нарадзілася... у Амерыцы — таксама падчас пошуку бацькамі лепшага жыцця, але вярнулася дахаты, на радзіму. Яе ж родная сястра, якая нарадзілася тут, з'ехала ў тую ж Амерыку. І яны, Камінскія-малодшыя, яго браты і сёстры — хто ў праваслаўі, хто ў каталіцтве. І няма тут ніякіх непаразуменняў, нават наадварот — агульныя святкаванні.

У 1387 годзе паўстаў у Крэве касцёл св. Яна Хрысціцеля. Ён быў адным з першых каталіцкіх храмаў, узведзеных Ягайлам у Вялікім княстве Літоўскім. Касцёл доўгі час карыстаўся пратэкцыяй з боку каралёў, князёў і іншых феадалаў. У 1636 годзе касцёл быў цалкам перабудаваны. Новы храм быў таксама з дрэва, але меў ужо бляшаны дах.

У сярэдзіне XIX стагоддзя касцёл быў зноў адбудаваны, але дзейнічаў нядоўга. Новы мураваны касцёл, узведзены ў 1850 годзе на месцы старога, пасля 1866 года быў зачынены, а потым перароблены пад царкву.

У полымі Першай сусветнай вайны ўсё гэта загінула, як і царква — ранейшы касцёл. Пасля вайны праваслаўныя адрамантавалі пашкоджаную царкву Аляксандра Неўскага, а касцёл вырашылі ўзвесці на тым самым месцы, дзе ён стаяў на працягу стагоддзяў. Грошы збіралі ўсёй грамадой, усе ахвяраванні ўлічваліся ў спецыяльнай кнізе, якая сёння знаходзіцца ў школьным музеі. Асвячэнне драўлянага храма адбылося ў 1936 годзе, на свяце прысутнічалі і праваслаўныя. І гэта нядзіўна, бо чаму праваслаўнаму не атрымаць асалоду ад цудоўнай арганнай музыкі, а каталіку не паслухаць разумныя казанні святара?..

А тым часам у Крэве зноў спыніў сваю дзейнасць касцёл. Царква хоць і працавала, але моладзь да яе не падпускалі. На пачатку 1960-х гадоў касцёл перарабілі пад бальніцу. І толькі праз тры дзесяцігоддзі на пагорку каля былога Рынкавага пляца паўстаў новы, гэтым разам мураваны, касцёл. І яго крыжы спакойна ўзіраюцца ў неба.

Генрых МІНІН

Фота Кастуся Дробава

Феномен Багушэвіча

Я думаю пра вечнае сваё, пра Францішка Багушэвіча.
"Дзённік"
Кузьмы Чорнага

Вядомы рускі філолаг Аўсяніка-Кулікоўскі, які ў 70-я гады XIX стагоддзя даследаваў гісторыю і наяўны стан сектанцтва ў Расіі, так характарызаваў свой час: *"...Повязі салідарнасці разбураны паміж людзьмі, і чалавек, адарваны ад чалавека, кінуты ў бездань сутыкнутых супярэчнасцяў"*. Паводле меркавання маладога тады вучонага, прадстаўнікі вышэйшых класаў, яго сучаснікі, не здольныя ў прынцыпе да культурнай творчасці і таму, шукаючы натуральную салідарнасць, кідаюцца ў містыцызм, п'янства, нелегальную палітычную дзейнасць у розных формах, шукаюць ратунку ў навуцы, нарэшце, у сям'і. Але ўсё гэта, лічыць даследчык, толькі *"сурагаты, якімі людзі думаюць запоўніць недахоп грамадзянскасці, знішчыць гнятлівае пачуццё адзіноты, выйсці з зачараванага кола ізаляванасці і пустаты"*. На маю думку, гэтае праўдзівае сведчанне неабыякавага сучасніка вельмі каштоўнае для пошуку шляхоў адэкватнага разумення таго феномена, якім стаўся ў роднай літаратуры Францішак Багушэвіч. Якраз на гэты застойна-стагнацыйны перыяд прыпадае этап яго ідэйна-творчага выспявання.

Ён сапраўды і справай, і словам рупіўся пра салідарнасць, а не ўзбуджаў сацыяльны антаганізм, як можа падацца павярхоўным назіральнікам і дагэтуль падавалася ангажыраваным чытачам. Ён сапраўды адчуваў сябе разгублена ў наяўнай рэчаіснасці. Ён сапраўды ледзь не з містычным трымценнем хацеў верыць у прысутнасць нейкай усеагульнай праўды і справядлівасці, якой не было і знаку ў рэальным жыцці. Ён сапраўды спазнаў сілу зялёнага змея. Ён сапраўды актыўна займаўся палітычнай дзейнасцю: непасрэдны ўдзел у антыўрадавым паўстанні, арганізацыя за мяжою нелегальных выданняў уласных твораў, якія кантрабандным шляхам траплялі ў край... Ён сапраўды педантычна і скрупулёзна працаваў над складаннем слоўніка беларускай мовы. Ён сапраўды імкнуўся сваімі публіцыстычнымі допісамі ў пецярбургскі часопіс "Kraj" процістаяць паўсюднай навале антыграмадзянскасці. На жаль, трэба думаць, не толькі па яго віне, пошукі шчасця ў сям'і сталіся для паэта малапаспяховымі. Не выклікае сумнення, што ён быў досыць канфліктным чалавекам, які сапраўды напоўніцу зведаў ізаляванасць, самотнасць, пустату. Ці не адсюль бярэ выток яго выключна і паслядоўна напорыстае жаданне і канкрэтная дзея сублімірацца ў мастацкай творчасці. Яны нібы адмаўляюць суровы прысуд, вынесены сучаснікам-даследчыкам, у няздольнасці прадукаваць культурныя каштоўнасці прадстаўнікамі прывілеяваных пластоў грамадства, у прыватнасці, тутэйшай шляхтай.

Вось чаму пра знешнє простага ў творчасці Багушэвіча пісаць не проста складана, а неверагодна цяжка. Невыпадкова апошняя абароненая манаграфія Васіля Барысенкі, прысвечаная яго творчасці, датуецца ажно 1957 годам. Пасля гэтага далёка не адзін, і зусім не пазбаўлены амбіцый, даследчык "падавіўся" Багушэвічам. І адна з прычын тут: яго роля, уздзеянне, значэнне — відавочныя, але механізмы поспеху не паддаюцца аналізу з прымяненнем апрабаваных схаластычных методык. І простыя Мацей Бурачок і Сымон Рэўка з-пад Барысава дагэтуль застаюцца не па зубах айчынным літаратуразнаўцам. Таму і мушу засяродзіцца на некаторых характэрных прыватнасцях.

Экспансія Багушэвіча — рэч невыпадковая ў пачатку XX стагоддзя. Зважайце. 1891 год. У Кракаве выдаецца "Дудка беларуская" нечуваным, нават па сённяшніх мерках, накладам — тры тысячы асобнікаў. Зыгмунд Нагродзкі, таварыш і, бадай, кампаньён, засведчыў: *"Дудка" была вельмі ходкая. 3000 надрукаваных у першым выданні экземпляраў хутка разышліся"*. Другое кракаўскае выданне 1896 года складалася ніяк не менш чым з 500 кніжак. Трэцяе, рэалізаванае ў Пецярбургу ў 1907 годзе выдавецтвам "Загляне сонца і ў наша ваконца", — 4300 асобнікаў у двух афармленнях: танным (25 капеек) і дарагім (50 капеек). Яно таксама не заляжалася на складах. Затым было здзейснена яшчэ пяць перавыданняў (Пецярбург, 1914; Вільня, 1918; Вільня, 1921; Коўна і Мінск, 1922). Другі зборнік паэта "Смык беларускі" саступаў у папулярнасці першаму. Але да 1922 года таксама пабачыла свет 6 ці 7 яго выданняў.

Экспансія Багушэвіча — рэч невыпадковая ў пачатку XX стагоддзя. Зважайце. 1891 год. У Кракаве выдаецца "Дудка беларуская" нечуваным, нават па сённяшніх мерках, накладам — тры тысячы асобнікаў.

Такім чынам, не выклікае сумнення, што па тыражнасці творы Багушэвіча ў першай чвэрці XX стагоддзя былі аднымі з самых "канкурэнтаздольных" на кніжным рынку Беларусі і ў мясцінах, дзе жылі тады расцярушаныя сусветнай вайной беларусы. Па сутнасці, яго паэтычныя зборнікі сталі, па цяперашняй тэрміналогіі, першымі бестселерамі ў беларускай літаратуры новага часу і, адпаведна, яны не маглі не зрабіць вызначальны ўплыў на літаратурны рух, на тагачасную эстэтыку, на густы шматлікіх чытачоў. Думаецца, што ў гісторыі сусветнай літаратуры няшмат знойдзецца выпадкаў, калі настолькі "неаб'ёмная" творчая спадчына зрабіла такі выключны ўплыў на нацыянальны літаратурны працэс. І ў гэтым феномен Багушэвіча выяўляецца найперш і найбольш.

Зрэшты, ёсць падставы гаварыць не пра феномен, а пра феномены Багушэвіча. Але гэта ўжо тэма іншай гаворкі. Тым не менш нездарма Кузьма Чорны напрыканцы жыцця ў сваіх шчырых дзённікавых запісах назваў Багушэвіча не толькі сваім, але і вечным.

Ігар ЗАПРУДСКІ

Тут добра пішуцца вершы

Слухаеш, як інтэлігентна і пранізліва спявае спаконвечная дудка беларуская ў руках Алеся Жамойціна, і здзіўляешся, што гэты чалавек мае ў біяграфіі дастаткова нечаканыя для дырэктара літаратурнага музея месцы працы — слесара на "Гомсельмашы", матарыста цеплахода "Днепра-Буг", механіка на Прыбалтыйскай чыгунцы. Галоўным захавальнікам спадчыннага маёнтка Францішка Багушэвіча ў фальварку Кушляны ён з'яўляецца ўжо больш як 20 гадоў. Сам жыве ў некалькіх кіламетрах ад музея. Прызнаецца, што нярэдка даводзіцца больш часу праводзіць у хаце класіка, чым у сваёй.

— Ці можаце адзначыць на такой насычанай карце ўласнага жыцця нейкі канкрэтны пункт, калі адчулі Багушэвічава прыцягненне?

— Я працаваў настаўнікам у тых самых Доцішках, дзе калісьці настаўнічаў Багушэвіч. Аднойчы мой сусед, старэйшы па веку чалавек, распавёў мне, што ягоны бацька быў вучнем Багушэвіча, і пацвердзіў тое рукапісным успамінам. Тады ў "ЛіМе" і з'явіўся мой першы артыкул. Гэтая цікавасць вылілася ў штудзіраванне вілейскіх архіваў і паступленне ў аспірантуру, дзе я стаў сур'ёзна даследаваць стасункі Багушэвіча і Яна Карловіча, а таксама ўсе беларуска-польскія фальклорныя сувязі. Недзе ў 1988 годзе мне даслаў ліст Міхась Ляпеха — фактычна першы захавальнік Багушэвічавай хаты. Ён папрасіў мяне замяніць яго на гэтай пасадзе.

— Мяркуючы па тым, як захавалася сядзіба да нашага часу, можна сказаць, ці добрымі гаспадарамі былі Багушэвічы?

— Каб упарадкаваць 300 гектараў, гаспадар павінен быць і таленавітым, і адказным, і мудрым. Пра гэта сведчаць гаспадарчыя пабудовы канца XIX стагоддзя, якія тут былі — абора, студня, гумно. Сёння захавалася толькі абора — вельмі прыгожае збудаванне з каменнай кладкай сценаў, драўлянымі перакрыццямі. Пры Багушэвічах гэта быў увогуле двухузроўневы комплекс — унізе стаяла жывёла, а наверх заязджалі на конях і сыпалі ёй сечку. Дарэчы, да Свята пісьменства плануем у аборы адкрыць этнаграфічную выставу. Я яшчэ заспеў час, калі стаяла і гумно, але адразу сіл не хапіла яго адрэстаўраваць, а цяпер на гэта патрэбныя вялікія грошы. Яго бракуе, канечне, для цэласнага ўспрымання сядзібы.

Род Багушэвічаў жыў у Кушлянах з 1749-га і да 1940 года. Месца адметнае тым, што збоку ад маёнтка ішла транзітная дарога з Мінска ў Вільню, гэта значыць, што ўся гісторыя праходзіла каля Багушэвічаў.

— Хата мае вялікую гісторыю, як прайшла яна праз віхуры дзвюх войнаў?

— Род Багушэвічаў жыў у Кушлянах з 1749-га і да 1940 года. Месца адметнае тым, што збоку ад маёнтка ішла транзітная дарога з Мінска ў Вільню, гэта значыць, што ўся гісторыя праходзіла каля Багушэвічаў. Гэтую хату Францішак Багушэвіч пабудаваў сам у 1896 годзе і пражыў у ёй толькі два апошнія гады перад смерцю: з 1898-га па 1900 год, але ўвогуле на маёнтку прайшла ладная частка ягонага жыцця — тут была бацькоўская хата, якая прастаяла да 1930 года. Дарэчы, пахаваны паэт на Жупранскіх парафіяльных могілках, а ў сцены жупранскага касцёла была ўмураваная мемарыяльная дошка Багушэвічу. Для звычайнага смяротнага гэта фактычна кананізацыя, лепшага гонару ўжо не прыдумаеш.

Падчас Першай сусветнай вайны ў Багушэвічавай хаце месціўся нямецкі шпіталь. А ў Другую сусветную вайну немцы, не чапалі пабудову, магчыма таму, што каля яе знаходзіліся добра ўпарадкаваныя нямецкія могілкі, якія захаваліся з першай вайны. За савецкім часам хата была бібліятэкай і клубам. Так і дайшла да нас амаль у нязменным стане.

— Заўсёды кажуць пра асаблівы дух, што лунае ў паветры літаратурных музеяў, вы яго адчуваеце?

— У хаце вельмі добра пішуцца вершы, і такія, якія не даюць дробна плаваць — Багушэвіч прымушае трымаць узровень. Увогуле энергетыка адчуваецца, бо гэтая хата не была засмечаная прысутнасцю людзей злачынных: ні партсходаў, ні расстрэлаў, ні допытаў тут не адбывалася.

— Распавядзіце, калі ласка, пра тыя сапраўдныя рэчы, да якіх дакранаўся Багушэвіч, пра аўтэнтычныя выданні і рукапісы. Ці шмат іх можна пабачыць у музеі?

— Улічваючы, што ад 1940-га і да 1990 года хата была без гаспадароў, рэчаў аўтэнтычных ацалела не шмат. У кабінеце стаіць сапраўдная мэбля сям'і класіка — пісьмовы стол і тры крэслы. Ёсць у экспазіцыі дробныя побытавыя рэчы — напрыклад, сальнічка альбо кніжная закладачка з дзіцячага пакоя, якую дасталі пры рэстаўрацыі з-пад падлогі, маем таксама вышыванку, зробленую дачкой класіка — гэтая рэч, як і кожны вышываны ўзор, вельмі глыбока ўздзейнічае, выпраменьвае жывое. Некаторыя экспанаты захоўваюцца ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі — крэсла, гадзіннік Багушэвіча, прэс-камень, прывезены з Сібіры ссыльнымі паўстанцамі. Магчыма, калі б Багушэвічы не былі высланыя ў Сібір у 1940 годзе, то больш рэчаў захавалася б.

Што да аўтэнтычных кніг, то ў Беларусі ўвогуле першых выданняў Багушэвіча няма. У Заходняй Беларусі выходзіла шмат перавыданняў: з 1891-га па 1930 год іх было ажно 18. Магу толькі пахваліцца, што ёсць у музеі два аўтэнтычныя зборнікі пецярбургскай суполкі "Загляне сонца і ў наша ваконца".

Рукапісы Багушэвіча не былі знойдзеныя. Адам Мальдзіс калісьці шукаў разам з унучкай Багушэвіча Станіславай Тамашэўскай, якая была адной з апошніх насельнікаў хаты. Яны адкапалі слоік, і з тых збуцвелых папер крыміналісты змаглі выявіць толькі адну літару. У Беларусі, на жаль, архіва Багушэвіча не існуе. Каштоўныя рукапісы сканцэнтраваныя па-за межамі нашай краіны — у Вільні, Львове, Варшаве, Кракаве. Багушэвічавы нашчадкі жывуць у розных гарадах Польшчы.

— Ёсць нейкія ідэі, як прыцягнуць у музей больш наведнікаў? Да прыкладу, як вы ставіцеся да таго, каб арганізоўваць вясельныя паездкі ў спадчынны маёнтак класіка?

— Калі пасля заключэння шлюбу маладыя прыедуць сюды, каб пачаць свой шлях фотаздымкамі на фоне Багушэвічавай сядзібы, — цудоўна, сям'я будзе мець пэўны нацыянальна-патрыятычны ўплыў. Такая традыцыя пачынае ўжо нараджацца. Але нам трэба для гэтага ўвесь час удасканальваць тэрыторыю сядзібы. Напрыклад, насупраць маёнтка цурчыць чыстая, спаконвечная крынічка, калісьці яна напаўняла Багушэвічаву сажалку, а сёння жывіць два суседнія возеры. Хочацца, каб яна не толькі сімвалічна прысутнічала, але і магла напаіць, бо на сядзібе адчуваецца недахоп вады. Увогуле вялікі рамонт быў зроблены ў хаце за апошнія пяць гадоў. Да юбілею Багушэвіча, які будзе адзначацца ў наступным годзе, яна фактычна гатовая.

Саша ДОРСКАЯ

На здымках: маёнтак Ф. Багушэвіча; А. Жамойцін.

У карагодзе Свята — вуліцы

Вуліца Кірава

Сучасная вуліца Кірава — адна з самых працяглых у Смаргоні. Але такой яна стала зусім нядаўна, толькі пасля пабудовы мікрараёна Карані, калі вёска Мінкі далучылася да горада.

Пачынаецца вуліца ў цэнтры горада, каля пошты, перакрыжаваннем з вуліцай Танкістаў і заканчваецца ў мікрараёне Карані ля помніка землякам каля будынка былога праўлення калгаса імя Калініна. На вуліцы Кірава знаходзяцца раённы ваенкамат, адзін са старэйшых будынкаў горада: калісьці тут было валасное ўпраўленне (1904) і райкам кампартыі (пасля Вялікай Айчыннай вайны). Месцяцца тут пошта, прадуктовы рынак і школа мастацтваў імя М. Кл. Агінскага. Адрэзак вуліцы да сучаснай лазні калісьці быў Рынкавай плошчай (яшчэ пры Зяновічах, прыблізна з 1622 г.), на якой стаялі Спаса-Прэабражэнская царква і «будынак вольнага пажарнага таварыства» (фотаздымкі іх захаваліся да нашых дзён). У 1939 годзе Рынкавая перайменаваная ў плошчу Свабоды. На вуліцы ў старыя часы месцілася карчма, пры якой, паводле слоў старажылаў, з'явілася першая ў Смаргоні гарбарня.

На вядомым плане Смаргоні 1905 года старажыла горада Корсака на вуліцы былі чатыры гарбарні, якія належалі Страшынскаму, Шаламовічу, Бінербуцкаму і Садоўскаму. На месцы сучаснай школы мастацтваў імя М. Кл. Агінскага тады месцілася народная школа. Сучасную ж назву сваю вуліца атрымала ў савецкі час. Названа яна ў знак памяці пра савецкага партыйнага і дзяржаўнага дзеяча Сяргея Кірава.

Вуліца Гастэлы

Адна са старэйшых вуліц нашага горада, вядомая раней пад назвай Гарбарная. Назву сваю вуліца атрымала ад таго, што на ёй жылі ў асноўным рабочыя — гарбары. Наогул Смаргонь перад Першай сусветнай вайной была буйнейшым цэнтрам гарбарнай вытворчасці ва ўсім Паўночна-Заходнім краі — мелася тут больш як 30 такіх заводаў.

Геаграфічна вуліца захавалася да нашага часу амаль нязменнай, але дзве сусветныя вайны і мірныя перабудовы змянілі яе выгляд. Няма тых драўляных дамоў і тратуараў, яны зніклі яшчэ ў вогнішчы Першай сусветнай. Два завулкі, як і цяпер, звязвалі яе ў 1905 годзе з вуліцамі Мядзведскай (Танкістаў) і Зарэчнай (А. Іванова).

Тут, у цяпер знесеным будынку былога ЗАГСа, раней знаходзіўся гарсавет, а да вайны размяшчаліся цукерня і крама Шульмана.

Пачыналася вуліца ў тым месцы, дзе сучасны праезд да стаянкі машын на плошчы, за помнікам У. Леніну. Пасля вайны і пазней, у гады майго дзяцінства, там быў невялікі сквер і драўляны будынак райана, да рэвалюцыі ж, верагодна, тут быў гарбарны завод Гаса. Далей па вуліцы, насупраць першага ад касцёла завулка Гастэлы на правым баку была ў дарэвалюцыйны час яшчэ адна гарбарня — гаспадара Кальварыцкага. Апісанне вуліцы таго часу сустракаем у артыкуле Н. Маркавай цыкла "Стары альбом.Смаргонь": "Удалечыні відаць шкляны ліхтар, які кожны дзень здымалі і запраўлялі газай. Рабіў гэта спецыяльна прызначаны чалавек. Вуліца была брукаваная, зроблены глыбокія зліўныя канавы, вымашчаны драўляны тратуар. За яго станам мусіў сачыць кожны гаспадар прылеглага дома. А дамы тады ў Смаргоні будавалі вельмі шчыльна адзін пры адным. Горад як бы знаходзіўся пад адным дахам. Гэта цесната была абумоўлена дарагоўляй гарадской зямлі, па кішэні яна была толькі багатым яўрэям, якім набываць зямлю забаранялася. Вось і туліліся дамы, ствараючы вялікую небяспеку пры пажарах".

Сучасная вуліца і цяпер вельмі ціхая і ўтульная, на ёй з'явіліся прыгожыя катэджныя будынкі. Тут жывуць ветлівыя, прыгожыя людзі. Дарэчы, тут у 1948 годзе нарадзіўся ганаровы жыхар нашага горада, беларускі публіцыст, перакладчык і дыпламат Уладзімір Шчасны. На вуліцы жывуць людзі розных спецыяльнасцей, шмат ветэранаў, старажылаў нашага горада, ад якіх можна даведацца шмат цікавага. У канцы вуліцы больш ажыўлена, тут на месцы былога сквера пабудаваны два шматпавярховыя дамы і Дом правасуддзя. Будынак міліцыі адзін са старэйшых у горадзе і таксама мае сваю цікавую гісторыю. Пабудаваны ён пры Польшчы ў 1924 годзе, як будынак паліцыі. На фасадзе будынка вісіць сціплая мемарыяльная дошка смаргонскім міліцыянерам, якія загінулі ў 1944 — 1946 гг. у барацьбе супраць ворагаў савецкай улады. Дарэчы, аддзел унутраных спраў мае свой музей з цікавымі экспанатамі.

Вуліца А. Іванова

Старажытная назва вуліцы — Зарэчная. І сапраўды, ад старажытнага цэнтра горада яна працягнулася па правым крутым беразе ракі Оксна, за ракой ад цэнтра. У Радзівілаўскім інвентары 1788 года ўпамінаюцца чатыры двары за ракой Оксной — навасёлы гасподскага двара. Можа, гэта і было пачаткам будучай вуліцы?

Вуліца старажытная, на картах XIX ст. яна хіба трошку карацейшая. Бліжэй да цэнтра на ёй захаваліся некалькі старажытных пабудоў: скляпы і нават цэлы дом.

Мала хто ведае, што радзімай абаранак з'яўляецца Смаргонь. А што пяклі Смаргонскія абаранкі, у тым ліку і на вуліцы Зарэчнай, у тым самым двары, я пачуў упершыню ад Валянціна Бортніка.

Цяперашняя вуліца Іванова пачынаецца на перасячэнні вуліц Леніна і Чырвонаармейскай ля крамы "Анастасія" і Палаца шлюбу, а заканчваецца новым катэджным пасёлкам ля парку Перамогі, перасячэннем з вуліцай Камінскага ў напрамку на Вілейку. Вуліца ціхая і ўтульная, з жывапіснымі краявідамі на ўскраіне горада. Тут няма вялікіх прадпрыемстваў і ўстаноў. Старой забудовы амаль не засталося — падчас Першай сусветнай тут праходзіла першая лінія абароны рускіх войск, а ў ліпені 1944-га па вуліцы ішлі танкі генерала Асланава, вызваляючы наш горад ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод вызваліцеляў быў і А. С. Іваноў. Ён пасяліўся на гэтай вуліцы. Удзельнік Вялікай Айчыннай Вайны, узнагароджаны ордэнам Чырвонай зоркі, медалём "Партызану Айчыннай вайны" І-й ступені, нарадзіўся ён у вёсцы Паруб'е Полацкага раёна. Лейтэнант, старшы оперупаўнаважаны Смаргонскага РА МДБ. Загінуў ад рук бандытаў у пасляваенны час. Тады ж вуліцы Зарэчнай было прысвоена імя героя.

Магіла А. С. Іванова знаходзіцца ў цэнтральным гарадскім парку.

На вуліцы месціцца Смаргонская дзяржаўная школа-інтэрнат для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Яна адчыніла свае дзверы 15 жніўня 1963 года. Першым дырэктарам стаў П. Шкляраў. З таго часу школа шмат разоў перабудоўвалася, пакуль набыла сучасны выгляд. Адзін знакаміты Зімовы сад чаго варты.

Дарэчы, мост праз Оксну і праезд ад інтэрната да вуліцы Танкістаў раней не існавалі. Дзеці на заняткі ішлі праз маляўнічую, тады драўляную, лесвіцу, над кладкай праз Оксну, насупраць вуліцы Інтэрнацыянальнай. Яшчэ адна кладка, таксама драўляная, была насупраць бальніцы.

Вуліца Танкістаў

Там, дзе дрэвы
да хатаў туляцца
Пазіраючы ў ранак чысты,
Называюць смаргонцы вуліцу
Па-ваеннаму строга:
Танкістаў

Аркадзь Падгол

Вуліца Танкістаў — адна са старэйшых вуліц нашага горада, вядома з 1622 года пад назвай Скамарошая, затым Мядзведская. Смаргонь у тыя гады была ўладаннем Зяновічаў. Цэнтр мястэчка займаў рынак, ад якога разыходзіліся пяць вуліц: Віленская, Крэўская, Дворная, Касцёльная і Скамарошая. У былыя часы, асабліва пры Радзівілах, Смаргонь славілася сваёй школай дрэсіроўкі мядзведзяў — "Мядзведжай акадэміяй". Знаходзілася яна, паволе слоў старажылаў, у канцы вуліцы, прыблізна насупраць могілак. Тады там была вялікая гара, на схіле якой былі выкапаны ямы для дрэсіроўкі мядзведзяў. У канцы 20-х гадоў палякі пры пабудове каменнага моста праз Гервятку зрэзалі гэты бугор. Скамарохі вадзілі выхаванцаў акадэміі па ўсёй тагачаснай Еўропе, адсюль і мядзведзь на гербе Смаргоні, і назва вуліцы, спачатку — Скамарошая, а потым — аж да 1939 года — Мядзведская. Пасля ўз'яднання з Усходняй Беларуссю Рынкавая плошча была перайменаваная ў плошчу Свабоды, а вуліца атрымала назву Танкістаў. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў Смаргоні стаяў 52-і процітанкавы дывізіён 24-й Жалезнай Самара-Ульянаўскай стралковай дывізіі пад камандаваннем генерала К. Галіцкага. Размяшчаўся ваенны гарадок якраз у канцы вуліцы Танкістаў у будынку гандлёвай школы на тэрыторыі цяперашняй раённай бальніцы. Падчас Вялікай Айчыннай вайны, са жніўня 1941-га па 1943-і немцы ператварылі яго ў лагер ваеннапалонных, дзе ўтрымлівалася прыкладна тысяча чалавек. Адсюль вадзілі палонных пешшу на работы ў горад і на чыгунку. Тут жа, ля старых могілак, расстрэльвалі. Пасля вайны тут знайшлі магілы, у адной з якіх пахавана 320 чалавек.

Сучасная вуліца Танкістаў пачынаецца ад скрыжавання вуліц Леніна, Гагарына, Савецкай і плошчы Леніна. Ад помніка вызваліцелям Смаргоні ў напрамку да раённай бальніцы.

Могілкі на горцы ля зліцця рэчак Оксна і Гервятка абнесены каменнай агароджай. Паводле непацверджаных звестак заезджых даследчыкаў, гэта старое гарадзішча. І сапраўды, месца мае ўсе прыкметы старадаўняга паселішча. Тут пахавана шмат знакамітых людзей нашага горада, напрыклад, І. Сініцкі, А. Дзяруга, В. Сінкевіч і многія іншыя.

Мосцік праз Гервятку быў пабудаваны ў 20-х гадах мінулага стагоддзя з каменю на вапнавым растворы, цяпер ён узяты ў бетон.

За мостам, у напрамку да бальніцы ў мінулым быў так званы конны рынак, тут гандлявалі "з калёс" жывёлай, якую на час таргоў пускалі пасціся да рэчкі, наймаючы мясцовых дзяцей яе даглядаць. Раней у Смаргоні кірмашы праводзіліся пяць разоў на год (3 — восенню і 2 — зімой), а двойчы на тыдзень ладзіліся невялікія базары.

Аляксей БУМАЙ,
краязнаўца
Фота Кастуся Дробава

Пра гісторыю, традыцыі і сённяшні культурны асяродак у Залессі і ваколіцах расказвае супрацоўніца Залескай бібліятэкі-цэнтра этнакультурнай асветы "Спадчына" Смаргонскага раёна Таццяна ГОРБАЧ.

Залеская шчырасць

Першае, што нас уразіла, як мы з калегай зайшлі ў бібліятэку, — гэта гутарка на беларускай мове: размаўлялі Таццяна Вікенцьеўна і адна з чытачак.

Таццяна Горбач прыняла нас гасцінна-ветліва, а даведаўшыся, адкуль мы, адразу, не марудзячы ні секунды, павяла па ўстанове культуры. Першай была дзіцячая зала з разнастайнымі выданнямі для дзятвы, экспазіцыямі малюнкаў. Яе ўпрыгожвалі кветкі, цацкі, нават шпалеры настройвалі на вясёлы лад. Усё агулам нібы маладзіла, скідвала з плячэй пражытыя гады і вяртала ў дзяцінства.

Наступная — зала этнакультурнай асветы "Спадчына" з прадметамі побыту, сялянскімі прыладамі, ручнікамі, куфрамі, прасамі, гарлачамі... Усе выстаўленыя экспанаты падаравалі людзі з навакольных вёсак. Тут для дзяцей праводзяцца экскурсіі, ім тлумачаць, як ужывалі тую ці іншую рэч. Адным словам, усё робіцца для таго, каб дзятва ўбачыла і запомніла, як жылі і чым карысталіся іх продкі, ганарылася сваёй самабытнай гісторыяй і захоўвала культурныя набыткі...

"На сённяшні дзень у бібліятэцы на абанеменце 950 чалавек. Дзеці, якія прыязджаюць на канікулы, — зазначае Таццяна Вікенцьеўна, — *усе прыходзяць да нас па кнігі. Бо, як вы ведаеце, на лета задаюць прачытаць вельмі шмат твораў з беларускай і рускай літаратур.*

Усім вельмі даспадобы выстаўка "М.Кл. Агінскі і яго час", якая лічыцца у нас асноўнай. Людзей, якія прыязджаюць да нас упершыню, я спачатку знаёмлю з гэтай выстаўкай. Таксама прыцягвае ўвагу наведвальнікаў экспазіцыя "Уладар Паўночных Афін", дзе сабрана ўся літаратура, якая датычыць жыцця і дзейнасці М.Кл. Агінскага. Прыязджалі да нас яго нашчадкі, прынамсі Анджэй Залускі быў тут пару дзён і пісаў сваю кнігу "Час і музыка Міхала Клеафаса Агінскага".

Акрамя вышэй названых, працавалі іншыя экспазіцыі: "Кніг запаветныя старонкі", "З крыніц народных", "Абдымаюць рукі Беларусь", "Мая зямля — залескі кут", "У родным слове цэлы свет", "Прырода Залесчыны" ў малюнках дзяцей старэйшай групы дзіцячага садка...

"Насельніцтва Залесся каля дзвюх тысяч чалавек. Абслугоўваем яшчэ і дзевяць навакольных вёсак, — працягвае Таццяна Горбач. — *Я бяру перыёдыку і кнігі, саджуся на ровар і паехала. Усе мяне вельмі чакаюць. Ёсць цікавыя моманты ў рабоце, калі прыязджае да нас якая-небудзь праверка, прыкладам, з Гродна. Адкрываюць лісты-абанементы і кажуць: "Жанчыне 82 гады, яна што, чытае?". Я ў адказ запрашаю яе наведаць і самім пераканацца ў гэтым. Вось яшчэ прыклад. Побач са мной жыве былая дырэктар школы, у якой я вучылася. Яна была вельмі строгая і патрабавальная жанчына, усе вучні яе баяліся. Ёй ужо пад восемдзесят: сама ўжо згорбленая, крывенькая ад узросту, але чытае кнігі і перыёдыку".*

Як мы даведаліся, на вёсцы чытаюць часопіс "Полымя": карыстаюцца попытам лёгкія бульварныя жанры. Але людзі з адукацыяй, — Таццяна Вікенцьеўна адзначыла, што нікога гэтым не хоча крыўдзіць, — аддаюць перавагу краязнаўчай, гістарычнай, мастацкай літаратуры. Нават калі прыязджаюць землякі з Мінска, Масквы, Санкт-Пецярбурга, яна прапануе ім пачытаць па-беларуску, бо яны ж тут нарадзіліся і *"ўсе літары ведаюць"*. І тыя пагаджаюцца, перачытваюць тое, што калісьці ў школе праходзілі.

Фонд бібліятэкі налічвае каля 70 тысяч адзінак. У апошнія гады яго абнаўленне і паступленне кніг было неблагое. А цяпер у сувязі з крызісам крыху пагоршылася. А яшчэ Таццяна Горбач актыўна агітуе жыхароў да чытання: *"Прыязджаю ў вёскі і прапаную літаратуру. Некаторыя кажуць: вой, навошта нам твае кнігі. Я ў адказ: вы адкрыйце і прачытайце хоць некалькі старонак. Пагаджаюцца. Некаторыя мінчане прыязджаюць сюды адпачываць на свае дачы, дык яны чытаюць Быкава, Караткевіча...".*

Сярод наведвальнікаў бібліятэкі людзі рознага ўзросту: дзеці, школьнікі, студэнты, працоўны люд. Але самыя актыўныя чытачы ва ўзросце ад 55 да 65 гадоў. Так бы мовіць, выходзяць на пенсію, і ўсё — іншы статус. Са слоў бібліятэкара, яны бяруць не пару кніг: цёткі як прыйдуць, дык цэлымі торбамі, кніг па дзесяць адразу выпісваюць.

Раней Залессе славілася тым, што тут жыло шмат інтэлігенцыі, людзі былі, як цяпер кажуць, "прасунутыя", не раўнуючы — мясцовы "мазгавы цэнтр". Потым распаўся калгас: прычапіўся недзе там да Смаргоні, знеслі бальнічку, што Таццяну Вікенцьеўну вельмі абурыла, бо тая бальнічка яшчэ б і яе перажыла. А яшчэ яна марыць, каб адрадзілі сядзібу М.Кл. Агінскага.

Закончыўшы размову пра прафесійную дзейнасць, мы яшчэ шмат часу гутарылі з Таццянай Вікенцьеўнай. Яна натхнёна расказвала пра сваё жыццё, хату з аканіцамі, якую пабудаваў яшчэ яе дзед амаль восемдзесят год таму, пра вёску і вяскоўцаў, запрашала да сябе ў госці. Сама яна родам з вёскі Вётхава, што паблізу Залесся. *"Часам хто-небудзь цікавіцца, чаму менавіта Вётхава,* — распавядала Таццяна Горбач. — *Тлумачу, што як Агінскі тут быў, яго парабкі жылі ў нашай вёсцы. Прасеку ў ляску высеклі, вёска сама вузенькая, і ён назваў яе Ветхая, бо жылі ж батракі. Потым назву перайначылі на больш мілагучную. Ганарыся, што Арсень Ліс родам з нашай вёскі і мастак Павел Южык, які адкрыў там першую мастацкую школу. Мая цётка, якая нядаўна памерла ва ўзросце 85 гадоў, помніла і расказвала мне, як рабавалі маёнтак Агінскага, як цягнуў з яго кожны ўсё, што мог. Шкада і балюча...".*

Увогуле, даўно не даводзілася бачыць такіх шчырых людзей. Незнаёмыя людзі на вуліцах, усе без выключэння, ківаюць галавой, вітаюцца. А яшчэ з самага ранку, як мы толькі прыехалі на цягніку ў Залессе і запыталіся ў аднаго дзядка, як прайсці да сядзібы Агінскага, той адразу прамовіў: "Хадземце за мной, я вас правяду". Па дарозе, а гэта добрых паўтадзіны, ён расказваў нам пра сваё жыццё, аднавяскоўцаў, пра сваю гаспадарку. А на развітанне назваў свой адрас і таксама запрасіў нас завітаць да яго ў госці, калі ў нас раптам надарыцца вольная хвілінка.

Віктар КАВАЛЁЎ

На здымках: бібліятэкар Таццяна Горбач; фрагмент экспазіцыі бібліятэчнага музея.

Фота аўтара

Адной з падзей свята станецца адкрыццё дзвюх першых залаў Смаргонскага гісторыка-краязнаўчага музея. Сам музей адлічвае свой век з чэрвеня 1985 года. Тады была прынята пастанова аб адкрыцці музея на базе помніка архітэктуры — Кальвінскага збору, які цяпер стаў касцёлам. І менавіта там планаваліся экспазіцыі — з перспектывай размяшчэння фондаў. Планавалася таксама, што частка фондаў будзе захоўвацца і ў памяшканні раённага Дома культуры, які стаяў побач.

...І скрыпка Віктара Роўды

Але ў 1986 годзе ў ЦК КПБ было вырашана размясціць у гэтым памяшканні музей тэатра батлейка. Задума была цікавая. Але на той момант пад такі музей не тое што ў Смаргоні, а і ў рэспубліцы не было ніводнага экспаната. Працу можна было будаваць толькі на копіях, знойдзеных недзе па-за межамі Беларусі. Паехалі ганцы па ўсёй тэрыторыі СССР: працавалі ў тэатральным музеі імя А. Бахрушына ў Маскве, у музеі гісторыі этнаграфіі ў Ленінградзе — збіралі экспанаты, рабілі з іх копіі. Знайшлі беларускую батлейку, посах медзвяжатніка...

Пасля і гэты праект неяк прызабыўся, насталі іншыя часы. Памяшканне было перададзена вернікам, а супрацоўнікаў музея перасялілі ў Дом культуры. Праз некаторы час вернікі знайшлі дакументы, што і гэтае памяшканне было пабудавана за іх сродкі — як дом пры касцёле. Часова ў 1989 годзе музей перасяліўся ў сучаснае памяшканне па вул. Кутузава, 23, дзе знаходзіцца і цяпер.

Такім чынам, маючы сваю вялікую гісторыю, музей толькі пачынае фарміраваць асноўныя экспазіцыі.

"Мы адышлі ад сістэмы храналагічнага паказу гісторыі, — распавядае дырэктар музея Марыя Майсевіч. — Уласна, цяпер мы маем чатыры залы і чатыры тэмы. Першая зала будзе пра Крэўскі замак, уся яго археалогія, уся старажытная гісторыя. Так павялося, Крэўскае княства ў складзе Вялікага княства Літоўскага мела асаблівы статус. Усе, хто прэтэндаваў на вялікакняжацкі прастол, праходзілі як быццам стажыроўку — станавіліся ўдзельнымі князямі ў Крэве. Багацце музея — унікальная калекцыя раскопак Крэўскага замка. Тут і посуд, кераміка. І макет княжацкай вежы, і адзіная знойдзеная ў краіне звязка ключоў княжацкага ключніка.

Другая зала — гэта непасрэдна гісторыя горада. Як вядома, Першая сусветная вайна фактычна знішчыла горад. Цяперашні Кальвінскі збор — адзінае дарэвалюцыйнае памяшканне, якое часткова ацалела. Перад пачаткам першай сусветнай вайны ў горадзе было каля 15 тысяч насельнікаў. Паводле перапісу 1921 года (у складзе польскай дзяржавы) у Смаргоні налічвалася толькі 154 чалавекі — абсалютна мёртвы горад! Стварацъ такую экспазіцыю цяжка — экспанатаў практычна не засталося. Таму гісторыю Смаргоні паказваем праз Рынкавы кірмаш. Калісьці яго акалялі некалькі галоўных пабудоў. Касцёл і цяпер захаваўся на тым самым месцы. Там, дзе цяпер кінатэатр "Космас", стаяла царква, а на месцы сучаснага "Беларусбанка" месцілася сінагога. Паміж трыма гэтымі культавымі збудаваннямі быў рынкавы кірмаш. Смаргонь калісьці славілася сваёю гарбарнай прамысловасцю, абаранкамі. Аднак кірмаш — гэта і забавы таксама. Таму тут знаходзіцца месца і для батлейкі, і для знакамітай "мядзведжай акадэміі".

Трэцяя зала — "Святло і цемра XX стагоддзя". Дзве сусветныя вайны і невялічкі кавалачак мірнага жыцця.

І чацвёртая зала — знакамітыя землякі. Тое, што дораць госці і краязнаўцы. У Смаргоні можна ўбачыць 9 альманахаў цыкла "Першая сусветная вайна". Усяго іх было выдадзена 16. (Наша нацыянальная бібліятэка мае толькі некалькі такіх кніг). Набыць альманахі дапамог Уладзімір Шчасны. Ён падараваў музею таксама дзве карты, на якіх пазначана Смаргонь, варыянт адной з іх — копія Радзівілаўскай карты. Ім падаравана таксама літаграфія з малюнка Напалеона Орды з выяваю руін Крэўскага замка.

Віктар Уладзіміравіч Роўда падараваў музею сваю першую скрыпку, тут захоўваюцца магнітафон В. Роўды з першымі запісамі царкоўных песняспеваў, акварэлі Уладзіміра Церабуна. Шыкоўны фотаальбом былога паручніка Першай сусветнай, у якім каля 100 тагачасных фотаздымкаў. З канфіскатаў мытні — досыць цікавая калекцыя ікон ды ўзнагарод Другой сусветнай вайны. І вельмі каштоўныя экспанаты прыватнага характару і: пояс-засцерагальнік салдата — тканы пояс ручной работы. Таксама білет прадзеда жыхаркі Смаргоншчыны, які яна і перадала ў музей — Марцьена Мацкеля, прыгоннага селяніна з вёскі Кавалі Ашмянскага павета, якога памешчыца здала на 25 год у рэкруты (у 1854 годзе). Тут жа — ягоны медаль за крымскую вайну 1853-56 гг., сведчанне, што ён атрымліваў ваенны пансіён, а таксама фота: той самы салдат сярод сяброў, з надпісам па-польску: "пану 105 лят".

Ірына ТУЛУПАВА

На здымках: кінатэатр "Космас", на месцы якога стаяла царква; падарункі музею.

Фота аўтара

Наступны прыпынак Дня беларускага пісьменства — горад Хойнікі Гомельскай вобласці. Давайце крыху азнаёмімся з гэтым населеным пунктам і раёнам.

Год 2010, верасень, Хойнікі

Раённы цэнтр знаходзіцца ў 103-х кіламетрах на паўднёвы захад ад Гомеля. Паводле пісьмовых крыніц Хойнікі (Хвойнічак) вядомы з 1512 года як вёска так званага Брагінскага графства ў Вялікім княстве Літоўскім. Належалі Вішнявецкім, Шуйскім, Прозарам. З сярэдзіны XVI стагоддзя гэта мястэчка ў Рэчыцкім павеце. У першай палове XVII стагоддзя на невялікай пясчанай дзюне ў забалочанай пойме ракі Квеся Вішнявецкія пабудавалі замак з абарончымі сценамі, уязной вежай-брамай. Замак праіснаваў да XVIII стагоддзя. З канца XVII стагоддзя Хойнікі — цэнтр воласці.

Пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай у 1793 годзе мястэчка як цэнтр воласці Рэчыцкага павета Мінскай губерні ўвайшло ў Расійскую імперыю. У 1919 годзе Хойнікі ў складзе Гомельскай губерні ўвайшлі у РСФСР. З 18 снежня 1926 года гэта ўжо цэнтр раёна, спачатку Рэчыцкай, у 1927 — 1930 гадах Гомельскай акруг БССР. 29 верасня 1938 года населенаму пункту нададзены статус гарадскога пасёлка Палескай вобласці. 23 лістапада 1943 года Хойнікі вызвалілі войскі I Беларускага фронту. У 1954 годзе яны ўвайшлі ў Гомельскую вобласць, а 10 кастрычніка 1967 года гарадскому пасёлку нададзены статус горада...

Герб райцэнтра ўяўляе сабой шчыт галандскай формы, які мае полымяпадобнае дзяленне на дзве часткі: сярэбраную (белую) і зялёную. У вуглу зялёнага поля — залатая (жоўтая) эмблема замка.

Забудова горада злілася з бліжэйшымі пасёлкамі і вёскамі. У ім склаліся тры планіровачныя раёны: Старыя Хойнікі, Новыя Хойнікі і паўночна-заходні раён. У горадзе ёсць ПТВ, 4 сярэднія школы, спецыялізаваная дзіцяча-юнацкая школа алімпійскага рэзерву і музычная школа, цэнтр творчасці дзяцей і юнацтва, 2 дамы культуры, Дом рамёстваў, 4 бібліятэкі, краязнаўчы музей.

Сам жа Хойніцкі раён мяжуе з Калінкавіцкім, Рэчыцкім, Брагінскім, Нараўлянскім і Мазырскім раёнамі Гомельскай вобласці, а на поўдні — з Украінай. Тэрыторыя раёна знаходзіцца ў межах Гомельскага Палесся. Сярод карысных выкапняў ёсць торф, будаўнічы пясок, нафта, радовішчы якой пачалі распрацоўваць у 2004 годзе каля вёсак Дубровіца, Амелькаўшчына, Рашаў.

Сярод знакамітых людзей Хойніччыны — народны пісьменнік Беларусі Іван Мележ, Герой Сацыялістычнай Працы Алена Вяргейчык, паэт Мікола Мятліцкі, празаік Барыс Сачанка, мастак Уладзімір Гардзеенка, паэтэса Ала Канапелька...

Галоўная водная артэрыя — Прыпяць з прытокамі Віць і Тур'я, ёсць азёры Жартай, Ломыш, Стараселле, Масцішча... Функцыянуюць шматлікія меліярацыйныя каналы — Кліўскі, Кажушкоўскі, Амелькаўшчанскі, Конанаўскі... Таксама на тэрыторыі раёна знаходзіцца частка Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка, куды ўвайшлі землі, выведзеныя з карыстання ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

Помнікамі прыроды мясцовага значэння з'яўляюцца паркі "Рудакоў", "Барысаўшчына", "Хойнікі", хвоя "Каралева".

Як вядома, Хойніцкі раён адзін з найбольш пацярпелых у выніку чарнобыльскай трагедыі. Тут перасталі існаваць 49 з 99 населеных пунктаў, колькасць жыхароў скарацілася амаль удвая...

У цэнтры Хойнікаў на мяжы XIX—XX стагоддзяў быў сфарміраваны сядзібны комплекс, які ўключае сядзібу і парк. Будынак — помнік эклектычнай архітэктуры. Парк пейзажна-рэгулярнага тыпу планіроўкі. У вёсцы Барысаўшчына знаходзіцца архітэктурна-гістарычны комплекс XIX стагоддзя (маёнтак польскага пана Ястржэмбскага). У аснову кампазіцыі пакладзена рэгулярная планіроўка, якой падпарадкоўваюцца ўсе забудовы: сядзіба (не захавалася), жылыя і гаспадарчыя будынкі, парк. У вёсцы Рудакоў ёсць сядзіба, якую пабудаваў у пачатку XIX стагоддзя памешчык Уладзімір Аскерка: двухпавярховы цагляны будынак, парк і сад. У 1830 годзе тут нарадзіўся Аляксандр Аскерка — грамадскі дзеяч, ліберал, удзельнік паўстання 1863-га.

Сярод знакамітых людзей Хойніччыны — народны пісьменнік Беларусі Іван Мележ, Герой Сацыялістычнай Працы Алена Вяргейчык, паэт Мікола Мятліцкі, празаік Барыс Сачанка, мастак Уладзімір Гардзеенка, паэтэса Ала Канапелька...

Сетка культурна-асветніцкіх устаноў раёна складаецца з 26 бібліятэк, раённага Дома культуры, гарадскога цэнтра культуры і спорту, раённага Дома рамёстваў, 22 сельскіх дамы культуры і клубы, дзіцячай музычнай школы, трох музеяў: раённы краязнаўчы музей, музей І. Мележа ў вёсцы Глінішча і музей Б. Сачанкі ў вёсцы Вялікі Бор.

Створана два філіялы музычнай школы ў вёсках Судкова і Стралічава. Пры раённым Доме культуры дзейнічае народны тэатр, народны ансамбль "Спадчына", пры музычнай школе — дзіцячы ўзорны ансамбль "Верасок", ансамбль народнай музыкі "Крыніца".

Як зазначае намеснік старшыні Хойніцкага райвыканкама па ідэалогіі Віталь ***ШАЎЧЭНКА****, мясцовыя ўлады плануюць падрыхтаваць адметныя мерапрыемствы да Дня беларускага пісьменства. Ужо складзены і распрацаваны план, але ён пакуль не зацверджаны ў аблвыканкаме, таму пра яго асаблівасці гаварыць пакуль ранавата.*

Віталь Мікалаевіч падкрэслівае, што гэта значнае свята для нашай краіны. Будуць запрошаны беларускія пісьменнікі, будзе адведзена асобная пляцоўка для іх выступленняў. Асабіста для Віталя Шаўчэнкі Дзень беларускага пісьменства, у першую чаргу, — гэта сустрэчы і знаёмствы з нашымі літаратарамі, выдавецтвамі і выданнямі, а для гасцей свята — з мясцовым побытам, культурай адметнага краю.

Віктар КАВАЛЁЎ

На здымках: герб горада Хойнікі; карціна У. Гардзеенкі "Край майго дзяцінства"; Пакроўская царква.

Фота аўтара

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 4, 5)

Мар'ян ДУКСА (1943 г. н.) — паэт, публіцыст. Нарадзіўся ў вёсцы Каракулічы на Мядзельшчыне. Вучыўся ў Свірскім вучылішчы механізацыі, працаваў у калгасе. Скончыў філфак БДУ. Выкладаў мову і літаратуру ў Сольскай сярэдняй школе Смаргонскага раёна. Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП Беларусі імя А. Куляшова. Жыве ў вёсцы Солы Смаргонскага раёна. Аўтар зборнікаў «Спатканне» (1967), «Крокі» (1972), «Станцыя» (1974), «Прыгаршчы суніц» (1976), «Твая пара сяўбы», «Заснежаныя ягады» (1989), «Прыйсці да алтара» (2003) і інш.

Рыгор СЕМАШКЕВІЧ (1945 — 1982) — паэт, празаік, літаратуразнаўца. Нарадзіўся ў вёсцы Дамашы на Маладзечаншчыне. Працаваў дырэктарам Малінаўскай васьмігадовай школы Смаргонскага раёна. Аўтар зборнікаў вершаў «Леснічоўка» (1968), «Субота» (1973), сатырычнай аповесці «Бацька ў калаўроце» (1976), выйшла кніга выбранага «Лічыла дні зязюля» (1987).

Алесь ЖАМОЙЦІН (1955 г. н.) — паэт, культурны дзеяч. Нарадзіўся ў в. Малахоўцы Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. З'яўляўся навуковым супрацоўнікам, пазней стаў загадчыкам літаратурна-мемарыяльнага музея Ф. Багушэвіча ў вёсцы Кушляны Смаргонскага р-на. Аўтар паэтычнага зборніка «Азірнуўшыся не скамянею» (1989), артыкулаў пра К. Каліноўскага, Ф. Багушэвіча, Я. Карловіча.

Генадзь ПАШКОЎ (1948 г. н.) — паэт, перакладчык, публіцыст. Нарадзіўся ў вёсцы Ліпавічы Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці. У 1953 годзе сям'я пераехала ў вёску Войстам Смаргонскага раёна. Працаваў на Беларускім радыё, у часопісе «Полымя», у ЦК КПБ, намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Тэатральная Беларусь», галоўным рэдактарам «Цэнтральнай газеты», галоўным рэдактарам выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі». Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі. Аўтар шматлікіх кніг паэзіі і публіцыстыкі.

Павел САВОСЬКА (1941 г. н.) — пісьменнік. Нарадзіўся ў вёсцы Зарудзічы Смаргонскага раёна. Вучыўся ў Друйскім тэхнічным вучылішчы. Выдаў кнігу прозы «Запіскі халасцяка» (1988, 1994). Адзін з аўтараў калектыўных зборнікаў «Краю мой Нёман» і «Ранішняя дарога».

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:
Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19
Тэлефоны:
галоўны рэдактар,
намеснік — 284-66-73
Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
крытыкі
і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у Інтэрнеце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць свае прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3436
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 2.09.2009 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 4722

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 09033